

КУРЫЦЬ — ЗДАРОЎЕ ГУБІЦЬ

5

ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВІЛЕЙШЧЫНЫ



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 КРАСАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 64 (29944)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## Прэзідэнт ляціць у Маскву

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5—6 красавіка здзейсніць рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У Маскве 6 красавіка кіраўнік дзяржавы прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Удзельнікі мерапрыемства разгледзяць ход выканання Асноўных напрамкаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады і саюзных праграм. Яшчэ адна ключавая тэма — распрацоўка Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Традыцыйна частка пытанняў парадку дня ВДС будзе звязана з бягучай дзейнасцю ў рамках Саюзнай дзяржавы. На пасяджэнні падвядуць вынікі і абмяркуюць сумесную работу на будучы перыяд.

Напярэдадні, 5 красавіка, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правядуць асобную двухбаковую сустрэчу. На ёй лідары краін абмяркуюць шырокі спектр пытанняў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ЧЫЖЫК, першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Ва ўмовах імпартазамяшчэння мы разумеем, якая адказнасць кладзецца на распрацоўшчыкаў, на тых, хто прапануе новыя матэрыялы, новыя падыходы і тэхналогіі. Але можна быць упэўненымі, што мы справімся з тымі цяжкасцямі, якія перад намі ставіць час. Разам, у камандзе з прамыслоўцамі, навукоўцамі, мы вырашым гэтыя задачы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПАГРОЗЫ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНЫЯ. ЧАСАМ НЕВЕРАГОДНЫЯ»

### Аб чым Прэзідэнт Беларусі гаварыў з дырэктарам Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі

**На пачатку рабочай сустрэчы ў Палацы Незалежнасці Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Сяргею Нарышкіну за тую дапамогу, якую Служба знешняй разведкі Расіі аказвае перш за ўсё ў пераабсталяванні і абсталяванні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. «Вы, напэўна, гэта заўважылі, што апошнім часам мы і разведданымі абменьваемся больш інтэнсіўна, і якасць інфармацыі палепшылася, — звярнуўся да Сяргея Нарышкіна кіраўнік дзяржавы. — Гэта перш за ўсё звязана з актывізацыяй дзейнасці Камітэта дзяржбяспекі. Але і немалаважная роля — у тым, што расіяне вельмі сур'ёзна, і перш за ўсё вы, дапамагаеце нам у тэхнічнай разведцы».**



Беларускі лідар не хавае: без тэхнікі сёння наўрад ці можна атрымаць добрую, дакладную, выверaную інфармацыю. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што розныя падзеі ў свеце, у тым ліку спецыяльная ваенная аперацыя Расійскай Федэрацыі, прымусілі з усіх бакоў паглядзець на ўсе структуры сілавога блока. «Як я часта кажу, не было б гэтага, дык трэба было прыдумаць, каб нас дзесьці падштурхнуць, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — У сувязі з гэтым мы працаваць сталі актыўна».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пагрозы, якія даводзіцца назіраць, вельмі сур'ёзныя — часам, па яго словах, неверагодныя. За ўсім, што адбываецца навокал, з улікам імклівага развіцця тэхнічных сродкаў, спецслужбы не заўсёды могуць паспець прасачыць. У гэтай сувязі час ад часу ўзнікаюць пэўныя пытанні. «Але людзі павінны разумець: мы не ад Госпада Бога, таму ўсё прадугледзець не можам, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму і ў нас, і ў вас з'яўляюцца рознага роду адмарозкі менавіта ўнутры грамадства, на якіх робяць стаўку замежныя тэрарысты — іх іначай не назавеш. Гэта не разведка і не контрразведка, гэта проста нашы ворагі. Яны знаходзяць у нашым лагеры, як прынята казаць, адпаведных людзей і робяць на іх упор».

Прэзідэнт расказаў Сяргею Нарышкіну, што нядаўна ў Беларусі затрымалі тэрарыста, які выконваў заданні Службы бяспекі Украіны. «І самае галоўнае, што мяне больш за ўсё абурае, затрымалі ўжо больш чым 30 памагатых, — удакладніў беларускі лідар. — Яны адкуль? Яны былыя і сапраўдныя «сволачы», якія жывуць у нашым грамадстве. Іначай мярзоту гэтую я назваць не магу, якія здзяйсняюць, дапамагаюць здзяйсняць супрацьпраўныя дзеянні, тым больш тэракты, на ўласнай зямлі, супраць сваіх жа суайчыннікаў».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што работы ў нас вельмі шмат. «Але я хачу вас запэўніць, што мы абсалютна адкрытыя да супрацоўніцтва, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Вы гэта адчуваеце і бачыце. Удзячныя вам за тую інфармацыю, якую вы нам пастаўляеце і своечасова нас напружваеце па асобных пытаннях. Думаю, што наперадзе ў нас больш глыбокае супрацоўніцтва. На нас вы можаце разлічваць па тых кірунках, дзе мы штосьці можам».

СТАР. 2

На парадку дня

## Фінансавы дабрабыт, кантракты, жыллё...




Фота Лізаветы ГОЛАД.

### ...якія яшчэ праблемы хвалююць работнікаў адукацыйнай галіны

**Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі — адзін з найбольш уплывовых у краіне, ён аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах больш за 580 тысяч чалавек: работнікаў як дзяржаўных, так і прыватных устаноў адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук, навучэнскую моладзь, аспірантаў і дактарантаў. Іх завяванні і праблемы, занятасць і заробак — штодзённы клопат прафсаюзнай арганізацыі. На VI пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі яго старшыня Таццяна ЯКУБОВІЧ падвяла вынікі работы за 2022 год.**

СТАР. 6

Адпачынак

## ЧАС АДКРЫЦЬ ДЛЯ СЯБЕ РАСІЮ

**Летась Беларусь наведалі 3 мільёны 900 тысяч турыстаў. Пераважная большасць з іх — 96 % — расіяне. Летась упершыню з 2020 года колькасць турыстаў узрасла на 30 % і наблізілася да дакавіднага 2019-га. Нягледзячы на абмежаванні ў авіязносінах, у Беларусі пабывалі прадстаўнікі 73 краін. Выручка ад экспарту трыстычных паслуг склала летась 180 мільёнаў долараў, на 97 % гэта, зноў жа, унёсак расіян. Беларусы пры гэтым, як сцвярджаюць прадстаўнікі турыстычнай галіны, адпачываюць у Расіі таксама нярэдка. Летась з гэтымі мэтамі там пабывала каля паўмільёна суайчыннікаў. Асноўнымі маршрутамі з'яўляюцца Масква, Санкт-Пецярбург, Карэлія, а таксама іншыя буйныя гарады, з якімі маюцца авіязносіны.**

СТАР. 3




ISSN 1990 — 763X
23064

# «ПАГРОЗЫ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНЫЯ. ЧАСАМ НЕВЕРАГОДНЫЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сяргей Нарышкін, у сваю чаргу, падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за прадстаўленую магчымасць сустрэцца і абмеркаваць надзённыя пытанні. Акрамя таго, падчас візіту расійскай дэлегацыі ў нашу краіну запланавана чарговае сумеснае пасяджэнне калегій Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі і Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

«Наша ўзаемадзеянне раўнацэннае, уяўляе роўную ўзаемную цікавасць, — падкрэсліў Сяргей Нарышкін. — Штосьці ёсць больш моцнае ў нас, штосьці — у нашых беларускіх калег. Мы сапраўды ў апошнія гады самым сур'ёзным чынам узмацнілі наша ўзаемадзеянне з мэтай выяўлення і папярэджання ўсіх пагроз, знешніх пагроз, якія стаяць перад дзвюма нашымі краінамі, перад Саюзнай дзяржавай. У нас даволі сур'ёзныя планы ў гэтым кірунку — рухацца з тым, каб дапамагаць перш за ўсё палітычнаму кіраўніцтву нашых дзвюх краін на аснове той разведвальнай інфармацыі, якую мы атрымліваем, прымаць выверанія, дакладныя, стратэгічныя рашэнні».

**У тэму**

Іван ТЭРТЭЛЬ:

## «Варта чакаць сур'ёзнай эскалацыі абстаноўкі»

**У размове з журналістамі старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван Тэртэль адзначыў, што КДБ займаецца забеспячэннем элементаў нацыянальнай бяспекі. Аб абстаноўцы дакладваецца кіраўніку дзяржавы. «Фактычна наш Прэзідэнт у ручным рэжыме ў цяперашні час з улікам усёй вастрыні кіруе ўсёй нацыянальнай бяспекай», — удакладніў старшыня КДБ.**

### «Будзем рэагаваць аператыўна, жорстка»

Іван Тэртэль канстатаваў, што ў сярэднетэрміновай перспектыве ў нашым рэгіёне варта чакаць сур'ёзнай эскалацыі абстаноўкі. Яна, па словах старшыні Камітэта дзяржбяспекі, звязана з шэрагам абставінаў. «Для нас найбольш актуальным у цяперашні час з'яўляецца тое, чым займаецца ўвесь сілавы блок пад кіраўніцтвам Прэзідэнта, — заўважыў кіраўнік ведамства. — Гэта фактычна адбіццё атакі тэрарыстычнага кангламерату з тэрыторыі сумежных з намі дзяржаў. Мы канстатуем (і гэта, напэўна, не сакрэт: перыядычна прарываюцца такія сюжэты ў адкрыты эфір), што на тэрыторыі Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі, Чэхіі існуюць лагеры па падрыхтоўцы баевікоў. Мы ведаем канкрэтна вярбовачныя пункты, ведаем, хто гэтым займаецца. Мы ведаем лагеры па іх падрыхтоўцы, ведаем персанальна інструктараў, ведаем, хто ў гэтых адносінах і на якіх этапах праходзіць падрыхтоўку».

Старшыня КДБ расказаў, што завербаваных «адэптаў» з дапамогай замежных інструктараў рыхтуюць, напрыклад, на тэрыторыі Польшчы. Затым іх адпраўляюць для «абкаткі» на тэрыторыю Украіны, у тым ліку для ўдзелу ў актыўных баявых дзеяннях. І ўжо потым такія асобы закідваюцца на тэрыторыю іншых дзяржаў. У канчатковым выніку іх задача, па словах Івана Тэртэля, ускалыхнуць абстаноўку ў нашай краіне, дабіцца змены ўлады шляхам узброенага мяцяжу. Адзін з інструментаў — здзяйсненне тэрактаў.

«Вядома, усе гэтыя людзі з'яўляюцца інструментам у інтарэсах іншых дзяржаў, рухальнай сілай у вырашэнні тых геапалітычных праблем, якія ёсць у нашых суседзяў, — падкрэсліў старшыня КДБ. — У гэтых адносінах мы праводзім вялікую працу. На кожнага з гэтых людзей, хоць яны хаваюцца пад псеўданімамі і мянушкамі, у нас ёсць сваё дасье. Паслядоўна мы гэтую работу праводзім. І іх натхняльнікаў мы ведаем — цэнтры ў Варшаве, Вільнюсе і іншых сталіцах. Усіх іх чакае лёс, звязаны з гутаркай з генеральным пракурорам». У сувязі з гэтым кіраўнік ведамства нагадаў пра камісію для работы з тымі, хто жадае вярнуцца на Радзіму. Старшыня камісіі — генеральны пракурор Андрэй Швед.

Па ацэнках Камітэта дзяржаўнай бяспекі, з гэтай вясны на тэрыторыі нашай краіны плануецца актывізацыя тэрарыстычнай дзейнасці. І прагнозы спраўджваюцца. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Гэта і папярэджанне тэракту на аэрадроме ў Мачулішчах, і ліквідацыя тэрарыста ў Гродне. Па словах Івана Тэртэля, ёсць і іншыя прыклады, аб якіх КДБ яшчэ не расказвала.

Кіраўнік Камітэта дзяржбяспекі паведаміў, што Беларусь у тым ліку праце з міжнароднымі структурамі, якія займаюцца барацьбой з тэрарызмам: «Там ёсць разуменне ў гэтых адносінах. Мы працуем, і небесперспектыўныя нашы намаганні па прыцягненні да адказнасці гэтых асоб ужо праз міжнародныя механізмы». Аднак, па словах Івана Тэртэля, вельмі важна, каб і нашы грамадзяне былі больш пільнымі і ўважлівымі да таго, што адбываецца навокал. «Калі чалавек нават папрасіў у вас пажыць на кватэры, то гэта могуць быць розныя людзі, якія ў канчатковым выніку нясуць небяспеку для вас і вашай сям'і, — папярэдзіў ён. — У гэтай сітуацыі заклікаю нашых грамадзян звяртацца ў органы ўнутраных спраў, органы дзяржаўнай бяспекі. Мы будзем рэагаваць на гэтыя выпадкі аператыўна, жорстка. Дзе спатрэбіцца, прыцягваць і іншыя сродкі для вырашэння гэтых праблем».

### «Ніхто з затрыманых на тэрыторыі Польшчы не мае дачынення да дзейнасці беларускіх спецслужбаў»

Адказваючы на пытанне журналістаў аб затрыманні быццам бы беларускіх шпіёнаў на тэрыторыі Польшчы, кіраўнік КДБ падкрэсліў, што ўсе падзеі, якія адбываюцца сёння ў гэтай краіне, неабходна ацэньваць праз прызму парламенцкіх выбараў, запланаваных на найбліжэйшую восень. «Сітуацыя насамрэч там вельмі і вельмі няпростая, тэму шукаюцца любыя нагоды, каб умацаваць імідж дзейнай улады на фоне эканамічных праблем, — звярнуў увагу Іван Тэртэль. — Сапраўды, польскі бок заявіў аб затрыманні вялікай колькасці грамадзян, у тым ліку Рэспублікі Беларусь, якія нібыта маюць дачыненне да дзейнасці Камітэта дзяржбяспекі. Запэўню вас, што гэта насамрэч не адпавядае рэчаіснасці. Ніхто з затрыманых на тэрыторыі Польшчы не мае дачынення да дзейнасці беларускіх спецслужбаў. Сам асабіста правяраў, гатовы за гэта паручыцца і несці адказнасць».

Старшыня КДБ звярнуў увагу, што ў дачыненні да Беларусі істотна актывізавана разведвальна-падрыўная дзейнасць. «Прыадкрыю вам сакрэт: намі затрымана некаторая колькасць грамадзян Польшчы пры ажыццяўленні актыўных аперацый па агентурнай сувязі на нашай тэрыторыі, — расказаў ён. — Затрыманы здраднікі, з якімі яны працавалі на нашай тэрыторыі. Вядома, польскі бок любымі спосабамі хоча дабіцца абмену на каго-небудзь з гэтых сваіх грамадзян. Аднак ніхто з затрыманых імі асоб, якія быццам бы працуюць у інтарэсах Расійскай Федэрацыі або Рэспублікі Беларусь, задач спецслужбаў Рэспублікі Беларусь не выконваў».

Акрамя таго, як адзначыў Іван Тэртэль, беларускімі спецслужбамі затрыманы дзясяткі грамадзян Украіны за спробы здзяйснення тэрактаў, разведвальна-падрыўную і шпіёнскую дзейнасць на нашай тэрыторыі. «КДБ Рэспублікі Беларусь мае кантакты з усімі спецслужбамі свету, — канстатаваў кіраўнік ведамства. — У рознай ступені яны выкарыстоўваюцца. Да нас звярнуўся ў тым ліку ўкраінскі бок з просьбай памяняць сваіх некаторых грамадзян на кагосьці. Мы пагледзелі на прапанаваны спіс: нам не патрэбны наркаманы, гвалтаўнікі і іншыя людзі, якія адбываюць у іх пакаранне. Ёсць грамадзяне Прыбалтыкі, затрыманыя намі за здзяйсненне агентурных аперацый на нашай тэрыторыі. Пакуль у гэтых адносінах варта канстатаваць, што мы іх выяўляем у вялікай колькасці, а нам прад'яўляць прэтэнзіі нашы сапернікі з таго боку не могуць».

Кіраўнік КДБ заўважыў, што ў беларускіх спецслужбаў ёсць кантакты і са спецслужбамі Польшчы. «Мы, вядома, ім па ўсіх каналах даводзім інфармацыю, занепакоенасць, будзем глядзець на рэакцыю, у тым ліку пра лагеры (*па падрыхтоўцы баевікоў* — **«Зв».**) на іх тэрыторыі, спробы ўчынення тэрактаў і запланаваныя тэракты, — адзначыў Іван Тэртэль. — Я не хацеў бы прымяняць паняцце «чырвонай лініі», але ў міжнароднай практыцы гэта недапушчальныя выпадкі. Таму трэба разумець, што меры ў адказ будуць не менш, а можа, і больш дзейснымі з нашага боку, калі будуць дапушчаны такія сітуацыі».

Сяргей НАРЫШКІН:

## «Паміж нашымі спецслужбамі — атмасфера поўнага даверу»

**З рабочага кабінета кіраўніка дзяржавы дырэктар Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі Сяргей Нарышкін накіраваўся ў самую вялікую залу Палаца Незалежнасці, дзе адказаў на пытанні журналістаў.**

Аднак перш падзяліўся вынікамі сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. «Мы коратка далажылі аб выніках нашай сумеснай работы, канстатавалі, што паміж нашымі спецыяльнымі службамі — атмасфера поўнага даверу, якая дазваляе нам разам працаваць як адзінае цэлае, — падкрэсліў Сяргей Нарышкін. — Аляксандр Рыгоравіч зрабіў уласны аналіз той сітуацыі, якая складваецца вакол нашых дзвюх краін, вакол Саюзнай дзяржавы, у пэўнай ступені паставіў задачы».

Галоўнымі пагрозамі Саюзнай дзяржаве дырэктар Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі назваў імкненне групы заходніх дзяржаў, таталітарна-ліберальных рэжымаў Захаду, падтрымаць сваё глабальнае дамінаванне за кошт суверэнітэту іншых дзяржаў. «Мы — ні Расія, ні Беларусь, — вядома, гэтага не дазволім, — падкрэсліў ён. — Мы па-сапраўднаму суверэнныя дзяржавы, якія шануюць сваю свабоду, свой суверэнітэт, і ў нас няма ніякіх сумненняў у тым, што перамога будзе за намі».

### Пра супрацоўніцтва спецслужбаў і сітуацыю вакол Украінскай праваслаўнай царквы

Перад пачаткам сумеснага пасяджэння калегій Службы знешняй разведкі Расіі і Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі ў Сяргея Нарышкіна спыталі, які ўклад такі фармат узаемадзеяння спецслужбаў уносіць у далейшае ўмацаванне Саюзнай дзяржавы. Адказваючы на пытанне, дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі адзначыў, што адной з умоў паступальнага развіцця і нашых дзвюх краін, і Саюзнай дзяржавы з'яўляецца бяспека. «Мы разам вырашаем задачу выяўлення і папярэджання цэлага вялікага комплексу знешніх пагроз, якія мы бачым, адчуваем, — удакладніў ён. — Без гарантавання бяспечных умоў работы цяжка нашым дзвюм краінам, Саюзнай дзяржаве, вырашаць задачы ўласнага развіцця».

Журналісты пацікавіліся меркаваннем госця Палаца Незалежнасці наконт сітуацыі, звязанай з беспрэцэдэнтным ціскам на Украінскую праваслаўную царкву Маскоўскага патрыярхату. Па словах Сяргея Нарышкіна, цяперашні кіеўскі рэжым і яго гаспадары, што знаходзяцца ў сталіцах заходніх дзяржаў, імкнуцца не проста забараніць, а літаральна фізічна знішчыць кананічнае праваслаўе на тэрыторыі Украіны.

«У заходніх сталіцах разумеюць, што ва ўмовах краху ідэалогіі, ва ўмовах барацьбы за новы светапарадак кананічнае праваслаўе, рускае праваслаўе, з'яўляецца тым стрыжнем, той духоўнай сілай, якая працягвае быць асновай адзінства праваслаўных народаў, у прыватнасці народаў Расіі і Беларусі, — звярнуў увагу дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі. — Мы бачым, што Служба бяспекі Украіны ў літаральным сэнсе складае спісы нязгодных, нелаяльных, на якіх аказваецца ціск. Мы разумеем, што для заходніх сталіц, для кіеўскай улады ў пытаннях абвастрэння рэлігійнага канфлікту практычна няма ніякіх «чырвоных ліній». Сёння можна з упэўненасцю казаць аб тым, што сітуацыя ў гэтай сферы ва Украіне набыла рысы рэлігійнай вайны супраць кананічнага праваслаўя. Кіеўскі рэжым павінен разумець, што наступствы тых падзей будуць вельмі-вельмі дрэннымі, і за гэта прыйдзецца расплачвацца не аднаму пакаленню».

### Пра «імперскія амбіцыі» Польшчы і адкрыццё «другога фронту»

Спыталі прадстаўнікі масмедыя і пра рэакцыю Службы знешняй разведкі Расіі аб планах Польшчы рэалізаваць свае «імперскія амбіцыі» і вярнуць «страчаныя землі», якія ўваходзяць у склад Украіны. Сяргей Нарышкін заўважыў, што атрыманне кантролю над заходнімі тэрыторыямі сучаснай Украіны, над так званымі былымі ўсходнімі крэсамі Польшчы, з'яўляецца марай польскіх нацыяналістаў, становіцца ўжо элементам нацыянальнай ідэалогіі.

«Ад гэтай ідэі польскае кіраўніцтва адмовіцца ўжо не можа, — заўважыў ён. — Польскае кіраўніцтва лічыць, што ўмовай для рэалізацыі гэтай ідэі з'яўляецца крах украінскай дзяржаўнасці ў выніку ваеннага паражэння. Таму польская ўлада выступае супраць мірнага ўрэгулявання канфлікту на тэрыторыі Украіны, запэўнівае ў тым, што аказвае пастаянную дапамогу кіеўскаму рэжыму. Вядома, гэта сітуацыя пагаршае становішча Украіны і ўкраінскага народа. Польскае кіраўніцтва чакае ўдалага моманту, каб ажыццявіць кантроль над гэтымі тэрыторыямі».

Журналісты заўважылі, што Захад зацікаўлены ў адкрыцці «другога фронту» супраць Расіі ў канфлікце з Украінай. У сувязі з гэтым Захадам аказваецца ціск на кіраўніцтва Грузіі па пытанні сілавога аднаўлення цэласнасці краіны. «Яны бачаць, што сітуацыя на полі бою складваецца не на карысць Украіны, і такім чынам прымушаюць Грузію ўступіць у ваенны канфлікт з Расійскай Федэрацыяй», — патлумачыў сітуацыю Сяргей Нарышкін. У гэтай сувязі ён згадаў нядаўнія хваляванні ў Грузіі, звязаныя з абмеркаваннем у грузінскім парламенце закона аб так званых агентах замежных агентаў. Гэтыя хваляванні, па словах кіраўніка Службы знешняй разведкі Расіі, у многім былі ініцыяваныя Вашынгтонам і Лонданам праз інструменты няўрадавых арганізацый.

**Вераніка КАНЮТА.**

Грамадская думка

# Беларусы задаволеныя сваім жыццём, адчуваюць сябе ў бяспецы і не хочуць з'язджаць з краіны

## Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання

**Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 8 да 22 лютага правёў тэлефоннае сацыялагічнае апытанне «Грамадская думка аб праблемах, якія хвалююць насельніцтва». Рэспандэнтамі апытання сталі 900 беларусаў. Адно з пытанняў, на якое яны адказвалі: ці хацелі б вы з'ехаць з Беларусі? Адмоўна адказалі 86,5 працэнта апытаных. «Хацеў бы з'ехаць на пастаяннае месца жыхарства» — так адказалі 2,6 % рэспандэнтаў, «хацеў бы з'ехаць з мэтай часовай працы» — 8,6 %. Не змаглі адказаць толькі 2,3 %.**

«На дадзены момант гэтыя пазітыўныя лічбы дастаткова аб'ектыўныя. Будзем казаць шчыра, зараз няпростая геапалітычная сітуацыя ў свеце, ідзе спецыяльная ваенная аперацыя ў суседняй Украіне. Гэта ўсё, вядома ж, накладвае адбітак на міграцыйныя перавагі беларусаў, паскарае разуменне рызык, звязаных з пераездам за мяжу, робіць усё больш значным усведамленне каштоўнасці дома, роднай краіны. Мне здаецца, многія з тых, хто хацеў з'ехаць па тых ці іншых прычынах, гэта ўжо зрабілі раней», — адзначыў **Мікалай СУХОЦКІ, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук.**



На пытанне «У якой меры вас задавальняе зараз ваша жыццё?» 77,1 % апытаных адказалі, што задавальняе, «у поўнай меры задавальняе» — 37,2 %, «хутчэй задавальняе» — 39,9 %. Не задавальняе жыццё 17,7 % рэспандэнтаў: «хутчэй не задавальняе» — 12,6 %, «зусім не задавальняе» — 5,1 %, не змаглі адказаць 5,2 %.

Найбольш значны паказчык, які дае магчымасць выявіць сацыяльнае самаадчуванне насельніцтва, гэта задаволенасць жыццём. Паводле даных маніторынгавых апытанняў, якія праводзіў Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, гэты паказчык для беларусаў заўсёды быў дастаткова высокі. Нават у перыяд каранавіруса 2020-2021 гадоў, ва ўмовах эканамічных выклікаў 2022 года сацыяльны аптымізм грамадзян фіксаваўся вышэй за сярэднія значэнні, што сведчыць аб высокім патэнцыяле ў супрацьстаянні цяжкасцям, характэрным для большасці беларусаў аптымістычным поглядзе на жыццё», — адзначыў Мікалай Сухоцкі. Ён растлумачыў гэта тым, што ў краіне захоўваецца стабільны курс на сацыяльна арыентаваную дзяржаву. Пра гэта таксама казаў і Прэзідэнт у Пасланні народу і Нацыянальнаму сходу.

Рэспандэнтам таксама прапаноўвалася адказаць на пытанне: ці адчуваеце вы сябе ў бяспецы ў сваім доме, кватэры? «Так, заўсёды», — адказалі 77,8 % рэспандэнтаў, «часцей так» — 17,1 %, «часцей не» — 1,7 %, «не, ніколі» — 2,7 % апытаных, не змаглі адказаць 0,7 %.

«Сучасная сітуацыя ў свеце фарміруе ў прафесійным сацыялагічным асяроддзі запыт на ўключэнне ацэнкі ўзроўню бяспекі ў даследаванні сацыяльнага самаадчування. На мой погляд, такая высокая лічба (у 77,8 працэнта) чаканая. Сутыкнуўшыся з выклікамі апошніх гадоў, беларускі народ зразумеў, як лёгка страціць мір і бяспеку. Усведамленне міру і «дабрабыту» як ключавых каштоўнасцяў для беларусаў асабліва актуальнае ў кантэксце аб'яўлення 2023 года ў нашай краіне Годам міру і стваральнай працы. Пазітыўная ацэнка насельніцтвам сітуацыі ў сферы забеспячэння дзяржавай асабістай бяспекі з'яўляецца найважнейшым маркерам, які аб'ектыўна адлюстроўвае сітуацыю ў грамадстве, стан нацыянальнай бяспекі ў цэлым. На дадзены момант праблема асабістай бяспекі не ўваходзіць у лік найбольш актуальных праблем, якія хвалююць насельніцтва. Таксама важна, што грамадзяне вызначаюць для сябе самым бяспечным месцам уласны дом ці кватэру», — сказаў Мікалай Сухоцкі.

**Паводле БелТА.**

# ЧАС АДКРЫЦЬ ДЛЯ СЯБЕ РАСІЮ

## Усё вырашаюць авіярэйсы

Як паведаміў **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК,** наша краіна развівае адносіны амаль з усімі суб'ектамі ўсходняй краіны-суседкі, выпрацаваны стратэгіі ўзаемадзеяння з 90 % рэгіёнаў Расіі. Усе яны возьмуць удзел і ў юбілейнай выставе-кірмашы «Адпачынак-2023».

Найхутчэй развіваюцца турыстычныя сувязі з рэгіёнамі, з якімі ўдалося наладзіць авіязносіны.

— Днямі сустракаўся з кіраўніцтвам турыстычнай галіны Калужскай вобласці. У нас будзе новы авіямаршрут Калуга — Мінск. Акрамя таго, яны збіраюцца субсідзіраваць адпачынак калужскіх школьнікаў у нашай краіне. Тыдзень таму правялі перагаворы з калегамі з Ніжняга Ноўгарада. Дзякуючы наяўнасці авіярэйса ў іх таксама маецца вялікі пакет турыстычных прапаноў. Тое ж самае можна сказаць пра супрацоўніцтва з Башкартастанам: дзякуючы рэйсу Уфа — Мінск рэалізоўваецца, у прыватнасці, праграма «Башкірскае доўгажыхарства», у рамках якой пажылыя грамадзяне могуць падарожнічаць, — расказаў Алег Андрэйчык.

Ён падкрэсліў, што летась на розных пляцоўках прайшлі сустрэчы з кіраўніцтвам суб'ектаў Расіі, дзякуючы чаму расце турыстычная плынь, пры тым што ўсходнія суседзі вельмі цэняць нашу краіну.

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Ігар ЗАВАЛЕЙ** звярнуў увагу, што лагістыка, у прыватнасці авіязносіны, адыгрывае вырашальную ролю ў тым, ці паедуць у рэгіён або краіну турысты.

— Калі наша краіна мае працягласць 600 кіламетраў, то Расія — дзевяць тысяч кіламетраў. Калі не вырашыць праблему лагістыкі, турыстычнай плыні не будзе. У Расіі ёсць свае лаўкостары, і выдатна будзе, калі яны паглядзяць у нашым напрамку, — адзначыў парламентарый.

## Якія напрамкі найбольш цікавыя для расіян?

Як адзначыў **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ,** найбольшай папулярнасцю карыстаецца санаторна-курортнае аздараўленне, лячэнне і рэабілітацыя.

— У Расіі не хапае гэтай паслугі, яна не такая даступная, і гэта сярод расіян топ № 1 у нашай краіне, — падкрэсліў суразмоўнік.

Акрамя таго, у Беларусі больш чым тысячагадовая гісторыя, і ёсць населеныя пункты са старымі архітэктурнымі помнікамі, да якіх вядуць добраўпарадкаваныя дарогі, таму экскурсійныя праграмы, як арганізаваныя, так і самастойныя, таксама карыстаюцца попытам.

— Для жыхароў вялікіх гарадоў цікава з'ездзіць у іншы вялікі горад, таму масквічы, пецярбуржцы часта ўключаюць у свае маршруты Мінск, — адзначае Філіп Гулы.

Таксама ў спісе тураў выхаднога дня Магілёў і Брэст, бо яны маюць камфортныя гасцініцы са СПА-комплексамі. Цікавасцю карыстаецца экалагічны турызм, у прыватнасці, сплаў на байдарках і агратурызм. У Беларусі больш за тры тысячы аб'ектаў агратурызму, дзе штогод адпачывае каля паўмільёна чалавек. Знайшлі свайго аматара прамысловы і медыцынскі турызм. Усяго ў Беларусі даступна каля 20 відаў турызму.

## Масквічы, пецярбуржцы і прадстаўнікі суседніх рэгіёнаў

Як расказаў **генеральны дырэктар санаторна-курортнага ўнітарнага прадпрыемства «Белпрафсаюзкурорт» Мікалай МАЦЮКЕВІЧ,** санаторна-курортнае лячэнне ў нас праходзяць расіяне з 79 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

— Як сведчаць расійскія даныя 2017 года, чалавек, які прайшоў санаторна-курортнае лячэнне, паляпшае сваё здароўе ў 1,7 раза, затраты на яго лячэнне зніжаюцца ў тры разы, а ў людзей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі — у сем разоў, — прывёў лічбы кіраўнік «Белпрафсаюзкурорта». Ён адзначыў, што сёння беларускія здраўніцы маюць настолькі развітую базу, што яна дазваляе аказваць паслугі не толькі па аздараўленні і лячэнні, але і пражыванні любога ўзроўню камфорту і турыстычных паездках.

Летась у беларускіх санаторыях аздаравілася 934 тысячы чалавек, у тым ліку 149 тысяч замежнікаў, сярод якіх 139 тысяч — грамадзяне Расіі. У тым ліку каля 130 тысяч чалавек аздаравілася ў сістэме «Белпрафсаюзкурорта». Сярод іх 40 тысяч — замежнікі, прычым 39 тысяч — расіяне. У тым ліку 33 % склалі масквічы і жыхары Маскоўскай вобласці, 28 % — пецярбуржцы і жыхары Ленінградскай вобласці. Пры гэтым апошнім часам актыўна пачалі прыязджаць у Беларусь жыхары суседніх рэгіёнаў — Калужскай, Пскоўскай, Бранскай, Смаленскай абласцей.

Мікалай Мацюкевіч адзначыў, што адпачывальнікі беларускіх санаторыяў «памаладзелі». Калі раней сярэдні ўзрост складаў больш за 50 гадоў, то цяпер 42-43 гады. Папулярнасцю ў маладых сем'яў карыстаюцца туры выхаднога дня.

## Чым здзівіць «Адпачынак-2023»

Даведацца больш пра магчымыя турпаслугі і туры можна на 25-й юбілейнай выставе-кірмашы «Адпачынак-2023», якая пройдзе з 13 да 15 красавіка ў сталічным Палацы спорту. Тут можна будзе пазнаёміцца з 20 відамі турызму (непасрэдна ў акваторыі ракі Свіслач за Палацам спорту можна будзе прадэманстраваць магчымасці воднага і экалагічнага турызму), асаблівасцямі кожнага рэгіёна Беларусі і Расіі, наведаць выставу-продаж сувеніраў. Сваю турпрадукцыю будуць прэзентаваць не толькі прадстаўнікі ўсходняй краіны-суседкі, але і іншых краін СНД, Кубы, Венесуэлы. Непасрэдна на выставе можна будзе падабраць тур і набыць пуцёўку.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Краіны АПЕК+ скароцяць здабычу нафты да канца года



Краіны АПЕК +, у склад якіх уваходзіць Расія, добраахвотна скароцяць здабычу нафты да канца года, паведаміла РІА «Навіны». У заяве віцэ-прэм'ера РФ Аляксандра Новака гаворыцца, што Расія ажыццяўляе добраахвотнае скарачэнне здабычы нафты на 500 тысяч барэляў у суткі да канца года ад сярэдняга паказчыка здабычы паліва ў лютым, які вызначаны ў адпаведнасці з незалежнымі крыніцамі. Гэтае рашэнне з'яўляецца сур'ёзным і прэвентыўным рашэннем. Да такога ж скарачэння аб'ёмаў здабычы нафты звернецца і Саудаўская Аравія. У Міністэрстве энергетыкі адзначылі, што гэтае рашэнне з'яўляецца папераджальнай мерай, накіраванай на падтрыманне стабільнасці на нафтавым рынку.

## Засуха ў Канадзе можа прывесці да дэфіцыту збожжа на сусветным рынку

Канада сёлета можа страціць частку ўраджаю з-за засухі, якая ўсталявалася ў рэгіёне, што адаб'ецца на пастаўках збожжа на сусветны рынак. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на Bloomberg. Паводле звестак Мінсельгаса Канады, пачатак года ў краіне выдаўся другім самым засушлівым за апошнія 45 гадоў. Пры гэтым у трох правінцыях — Манітобы, Альберта і Саскачаван, — дзе развіта сельская гаспадарка, з пачатку восені 2022 года выпала на 60 працэнтаў менш за норму ападкаў. Засуха ў краіне можа перашкодзіць пасадцы сельскагаспадарчых культур вясной, а таксама знізіць агульную ўраджайнасць. Улічваючы, што Канада ўваходзіць у лік найбуйнейшых экспарцёраў рапсу і пшаніцы ў свеце, зніжэнне ўраджайнасці можа прывесці да дэфіцыту збожжа на глабальных рынках, адзначае Bloomberg.

## Жыхары Парыжа прагаласавалі за забарону арэнды электрасамакатаў

Афіцыйныя вынікі апытання прадэманстравалі, што амаль 90 працэнтаў парыжан, якія прагаласавалі, выказаліся за забарону пракату такога транспарту, паведаміла «Бі-бі-сі». Паводле афіцыйных звестак, з 1,38 мільёна чалавек, унесеных у спіс выбаршчыкаў горада, у выбарах прынялі ўдзел крыху больш за 103 тысячы. З іх больш за 91,3 тысячы чалавек прагаласавалі супраць скутараў.

Апытанне было праведзена ў адказ на рост колькасці людзей, якія атрымалі траўмы і загінулі на скутарах у Парыжы.

# Алкаголь — каталізатар злачыннасці

## Што робіцца дзеля зніжэння колькасці правапарушэнняў, здзейсненых нецвярозымі грамадзянамі?

**Празмернае ўжыванне алкаголю яшчэ ніколі не прыводзіла да дабра. Якасць жыцця асобы, якая злоўжывае спіртным, відавочна адрозніваецца ад жыццядзейнасці чалавека, які не мае гэтай згубнай звычкі. Разам з алкаголікам пакутуюць і члены яго сям'і, якія з-за такога небяспечнага суседства знаходзяцца ў зоне рызыкі: большасць злачынстваў, у тым ліку забойстваў, здзяйсняецца менавіта ў стане алкагольнага ап'янення.**

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, кожнае трэцяе злачынства ў краіне ўчыняецца нецвярозымі грамадзянамі. Абвінавачанымі ў забойствах і цяжкіх цялесных пашкоджаннях у 80—90 % выпадкаў з'яўляюцца тыя, хто на момант ажыццяўлення злачынства знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення.

Па выніках трох месяцаў бягучага года адзначаецца зніжэнне колькасці злачынстваў, здзейсненых нецвярозымі грамадзянамі. У немалой ступені гэта вынік комплекснай прафілактычнай дзейнасці органаў унутраных спраў. Размовы аб наступствах алкаголю ў працоўных калектывах, узаемадзеянне з урачамі-наркалагамі, адрасная работа з тымі, хто здзяйсняе правапарушэнні, — далёка не ўсе меры, якія прымаюцца супрацоўнікамі міліцыі дзеля паляпшэння сітуацыі.



### Абмежаванне продажу

— Алкаголь — каталізатар злачыннасці, — заўважае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Сяргей КРАСУЦКІ.** — Калі чалавек выпіў, яго свядомасць затуманьваецца і ён не заўсёды здольны кантраляваць сябе, таму схільны здзяйсняць пэўныя супрацьпраўныя дзеянні. Як правіла, у стане алкагольнага ап'янення злачынствы здзяйсняюцца ў грамадскіх месцах. Вельмі шмат фактаў, калі на фоне ўжывання алкаголю ўзнікаюць канфлікты, у тым ліку паміж блізкімі сваякамі, у сферы сямейна-бытавых адносін. Як правіла, пад уздзеяннем алкаголю здзяйсняюцца крадзяжы, прычым як запланаваныя, так і спантанныя. Хуліганствы, рабаванні, разбоі — тыя злачынствы, якія таксама ў асноўным ажыццяўляюцца нецвярозымі грамадзянамі.

Вядома, у Беларусі не сухі закон. Алкаголь сёння можа набыць любы паўналетні грамадзянін. За выключэннем усяго некалькі дзён на год — падчас выпускных вечароў і ў Дзень ведаў. Абмежаванні, звязаныя з продажам алкаголю ў гэтыя дні, станоўча адбіваюцца на крымінагеннай абстаноўцы. Менавіта зыходзячы з яе, супрацоўнікі органаў унутраных спраў могуць рэкамендаваць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам уносіць карэкціроўкі ў рэжым функцыянавання грамадскіх устаноў і пунктаў грамадскага харчавання, якія рэалізоўваюць алкаголь у начны час.

І такі досвед ужо ёсць. У прыватнасці, не так даўно адміністрацыяй Драгічынскага раёна была падтрымана ініцыятыва начальніка раённага аддзела ўнутраных спраў аб абмежаванні рэалізацыі алкагольных напояў на адной з заправачных станцый. «Месца было крымінагеннае, алкагольная прадукцыя на запраўцы рэалізоўвалася кругласутачна, — расказвае Сяргей Красуцкі. — З навакольных вёсак туды з'язджаліся людзі, якія любілі «дабавіць» і працягнуць банкет. У выніку каля той запраўкі адбываліся канфлікты паміж аматарамі спіртнога. Былі зафіксаваны хуліганствы, іншыя супрацьпраўныя дзеянні, у тым ліку цяжкія цялесныя пашкоджанні. Пасля рашэння райвыканкама аб абмежаванні рэалізацыі алкагольных напояў у начны час на згаданай запраўцы крымінагенная абстаноўка на тэрыторыі раёна палепшылася».

### Алкаголікі і беспрацоўныя — на кантролі

Дзейсная мера, якая ўплывае на зніжэнне колькасці злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення, — накіраванне алкаголікаў у лячэбна-працоўныя прафілакторыі (ЛПП). За тры месяцы бягучага года для праходжання лячэння ў гэтых установах ізалявана звыш паўтары тысячы аматараў спіртнога. Летась у ЛПП былі накіраваны 7328 чалавек, з якіх 4370 — беспрацоўныя.

Людзі, якія стаяць на ўліку ўрача-нарколага, асабліва калі яны яшчэ і не працуюць, з'яўляюцца першымі кандыдатамі для накіравання ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Такія грамадзяне — на кантролі органаў унутраных спраў. Пад павышаную ўвагу з боку супрацоўнікаў міліцыі трапляюць і тыя, хто ў стане алкагольнага ап'янення здзяйсняе адміністрацыйныя правапарушэнні.



Сяргей КРАСУЦКІ.

— Згодна з Законам «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх», калі чалавек у стане алкагольнага ап'янення прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці тройчы, маюцца падставы для правядзення ў дачыненні да яго першаснай медыцынскай камісіі і вырашэння пытанняў для накіравання яго ў ЛПП, — расказвае афіцэр. — Падчас медыцынскага агляду ўстанаўліваецца сіндром залежнасці і наяўнасць адсутнасці захворванняў, якія перашкаджаюць накіраванню ў ЛПП. Канчатковае рашэнне аб накіраванні такога грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый прымаецца судом.

Ян адзначае Сяргей Красуцкі, у цяперашні момант ідзе актыўная работа над змяненнем заканадаўства аб лячэбна-працоўных прафілакторыях. Новаўвядзенні, якія датычацца парадку і ўмоў накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі, а таксама ўмоў знаходжання ў іх, разгледжаны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні.

— У новай рэдакцыі мы прапануем адмовіцца ад складаных механізмаў ізаляцыі грамадзян у ЛПП, — удакладніў сутнасць канцэптуальных змен палкоўнік міліцыі. — Мы прапаноўваем, каб усе грамадзяне, якія ў стане алкагольнага ап'янення парушаюць адміністрацыйнае заканадаўства, накіроўваліся ў ЛПП па адным агульным парадку. Два правапарушэнні ў стане алкагольнага ап'янення — аб'яўляецца папярэджанне. Трэцяе правапарушэнне — медкамісія і суд. Для наркаманаў, якія будуць дастаўлены з атручваннем у медыцынскую ўстанову адзін раз, будзе аб'яўлена папярэджанне. Другая перадазіроўка наркотыкамі — і такога чалавека чакаюць медыцынская камісія і суд.

На асаблівым кантролі ў міліцыі знаходзяцца і працаздольныя непрацуючыя, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Калі непрацуючыя стаяць на ўліку ў аддзеле прафілактыкі правапарушэнняў за хатні гвалт або знаходзяцца на ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі як асобы, якія маюць нязнятую або непагашаную судзімасць, у адносінах да іх устанаўліваецца прэвентыўны нагляд. Такіх грамадзян рэгулярна наведваюць супрацоўнікі міліцыі. І не толькі каб пракантраляваць, у якім стане знаходзяцца іх «падапечны» і які спосаб жыцця ён вядзе, а і пацікавіцца, як ён паводзіць сябе з членамі сям'і, з суседзямі. Акрамя таго, нярэдка менавіта міліцыянеры дапамагаюць ім з працаўладкаваннем, бо, як правіла, адрасная работа з тымі, хто знаходзіцца ў зоне рызыкі, з'яўляецца стрымвальным фактарам для здзяйснення правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення.

### Каму прадаваць спіртное?

Дзеля прафілактыкі здзяйснення правапарушэнняў непаўналетнімі грамадзянамі ў стане алкагольнага ап'янення таксама праводзіцца шэраг мерапрыемстваў. З супрацоўнікамі сферы гандлю і грамадскага харчавання актыўна працуе інспекцыя па справах непаўналетніх, якая накіравана на выяўленне такіх фактаў.

Не можа не радаваць, што некаторыя нашы суайчыннікі маюць актыўную жыццёвую пазіцыю, бачаць многія праблемы ў нашым грамадстве, у тым ліку звязаныя з рэалізацыяй алкагольнай прадукцыі. Падчас аднаго з апошніх прыёмаў грамадзян, які на Гомельшчыне праводзіў міністр унутраных спраў, жыхар Гомельскага раёна звярнуўся да Івана Кубракова са сваімі ініцыятывамі і прапановамі, звязанымі са зніжэннем уплыву ўздзеяння алкаголю на грамадства. У прыватнасці, грамадзянін лічыць мэтазгодным павысіць мінімальны ўзрост для набыцця алкагольнай прадукцыі: з 18 — да 21 года. Акрамя таго, жыхар Гомельскай вобласці прапанаваў міліцэйскаму ведамству разгледзець увядзенне штомесячных дзён цвярозасці на тэрыторыі краіны, працягнуць інфармаванне насельніцтва праз СМІ аб шкодзе алкаголю і аб перавагах здаровага спосабу жыцця.

Яшчэ адна з ініцыятыў, агучаная Івану Кубракову падчас прыёму грамадзян, — разгледзець прапанову аб тым, што вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў Беларусі абавязаныя займаць служачыя, якія вядуць здаровы лад жыцця. Міністр унутраных спраў падзякаваў жыхару Гомельшчыны за актыўную жыццёвую пазіцыю і ўзяў яго прапановы на кантроль.

### Абмежаванне ў правах

Яшчэ адна з прафілактычных мер, якая ажыццяўляецца органамі ўнутраных спраў дзеля паляпшэння крымінагеннай абстаноўкі — працэдура абмежавання дзеяздольнасці грамадзян. З пачатку года пад яе трапіла каля 50 чалавек. Летась па рашэнні судоў у сувязі з ужываннем алкагольных напояў часткова абмежаваны ў дзеяздольнасці 348 чалавек. Такая мера дазваляе сваякам кантраляваць даходы блізкага чалавека, які злоўжывае алкаголем, што ў немалой ступені зніжае магчымасць набыцця ім спіртных напояў.

— Калі мы правядзём праверку і дакажам, што грошы грамадзянінам, у адносінах да якога ажыццяўляецца працэдура абмежавання дзеяздольнасці, марнуюцца на алкаголь, матэрыялы адпраўляюцца ў пракуратуру і суд, — расказвае Сяргей Красуцкі. — Менавіта суд прымае рашэнне аб абмежаванні дзеяздольнасці. Для такой асобы судом устанаўліваюцца забароны на ажыццяўленне буйных здзелак: адчужэнне маёмасці, падпісанне дагавораў і іншае. За грамадзянінам устанаўліваецца апякун (як правіла, гэта член сям'і, які звяртаўся ў міліцыю і прасіў аб абмежаванні дзеяздольнасці ў адносінах да сваяка), які кантралюе ўсе даходы і адказвае за ўтрыманне абмежаванага ў правах.

Адной з формаў прафілактычнай работы з'яўляюцца і прыёмы грамадзян участковымі інспектарамі міліцыі. Нагадаем, яны праходзяць кожную сераду: з 10.00 да 13.00 — у сельскай мясцовасці, з 17.00 да 20.00 — у горадзе. На такіх прыёмах да ўчастковых нярэдка звяртаюцца сваякі тых, хто злоўжывае алкаголем. Супрацоўнікі тлумачаць, якія меры можна прыняць у адносінах да такіх людзей, рэальна дапамагаюць у вырашэнні канкрэтнай праблемы.

Адным словам, захады, якія робяцца органамі ўнутраных спраў па зніжэнні ўжывання грамадзянамі алкагольных напояў і, адпаведна, скарачэнні колькасці правапарушэнняў і злачынстваў, здзейсненых нецвярозымі грамадзянамі, даказалі сваю эфектыўнасць. Аднак трэба разумець, што алкагалізацыя насельніцтва — гэта не толькі праблема міліцыі. Гэта пытанне, над якім павінны працаваць усе зацікаўленыя органы. А ў першую чаргу, пра ўласнае здароўе і эмацыянальны стан сваіх блізкіх павінен падумаць сам чалавек, якому трэба адмовіцца ад шкоднай звычкі.

Па законе

# Звычка, якая пагражае адказнасцю

## Аматарам пакурыць варта задумацца пра тых, хто знаходзіцца побач

**Ужо даўно даказана, што курэнне — небяспечная звычка, якая наносіць шкоду не толькі таму, хто не расстаецца з цыгарэтамі, а і людзям, якія знаходзяцца побач. Аднак пра гэта мала хто з залежных ад нікаціну клапоціцца. А калі і задумваецца, то наўрад ці сапраўды перажывае аб здароўі навакольных.**

Мінакоў з цыгарэтай у руках можна сустрэць, шпацыруючы па гарадскіх вуліцах і парках, чакаючы патрэбнага транспарту на прыпынку. Хочаш — не хочаш, узнікае нямала і іншых сітуацый, калі курэц прымусіць цябе дыхаць цыгарэтным дымам. Нярэдкія выпадкі, калі грамадзяне спажываюць тытунёвыя вырабы, выкарыстоўваюць электронныя цыгарэты на лесвічных пляцоўках жылых дамоў або ў іншых памяшканнях.

Аб шкодзе курэння для здароўя ўжо гаварылася неаднаразова — пра гэта ведае нават дзіця. А вось інфармацыяй пра юрыдычныя аспекты дадзенага пытання валодаюць нямногія. На якой падставе і пры якіх умовах асоба можа быць прыцягнута да адказнасці за курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў, расказаў **начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Вадзім ПЕТЫШ.**

### ДЗЕ НЕЛЬГА КУРЫЦЬ?

Супрацоўнік органаў МУС нагадаў, што пытанні, звязаныя са спажываннем тытунёвых вырабаў, выкарыстаннем электронных сістэм курэння, вадкасцяў для электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню, урэгуляваны Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2002 года № 28 (у рэдакцыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24.01.2019 № 2). Названым дакументам вызначаны пералік месцаў, дзе курыць нельга.



У цяперашні час спажыванне тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, а таксама сістэм для спажывання тытуню **забараняецца:**

— у ліфтах і дапаможных памяшканнях шматкватэрных жылых дамоў, інтэрнатаў;

— на дзіцячых пляцоўках;

— на працоўных месцах, арганізаваных у памяшканнях;

— на тэрыторыях і ў памяшканнях, дзе размешчаны спартыўна-аздараўленчыя і іншыя лагеры;

— у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюць установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы пасляўніверсітэцкай адукацыі;

— у падземных пераходах, на станцыях метрапалітэна;

— на прыпыначных пунктах маршрутаў аўтамабільных перавозак пасажыраў і перавозак пасажыраў гарадскім электрычным транспартам, пасадачных пляцоўках, якія выкарыстоўваюцца для пасадкі і высадкі пасажыраў;

— у аўтамабілях, калі ў іх прысутнічаюць дзеці ва ўзросце да 14 гадоў.

### ЁСЦЬ ВЫКЛЮЧЭННІ

Курыць, у тым ліку выкарыстоўваць электронныя сістэмы курэння і сістэмы для спажывання тытуню, таксама нельга, за выключэннем спецыяльна створаных для гэтых мэт месцаў, у наступных лакацыях:

— у гандлёвых аб'ектах і аб'ектах бытавога абслугоўвання насельніцтва, гандлёвых цэнтрах і на рынках;

— у аб'ектах грамадскага харчавання, на тэрыторыі летніх пляцовак (тэрас);

— у межах тэрыторый, занятых пляжамі;

— на тэрыторыях і ў памяшканнях, якія займаюць арганізацыі фізічнай культуры і спорту, фізкультурна-спартыўных збудаванняў;

— у вытворчых будынках (памяшканнях);

— у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюць дзяржаўныя органы, арганізацыі культуры і аховы здароўя, санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі, арганізацыі, якія аказваюць паслугі сувязі, сацыяльныя, банкаўскія, страхавыя, гасцінічныя і іншыя паслугі, а таксама арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, якім, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

— у памяшканнях, прызначаных для прыёму грамадзян, у тым ліку па пытаннях ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур;

— у памяшканнях пасажырскіх тэрміналаў аўтамабільнага транспарту, партоў і аэрапортаў;

— у памяшканнях і на тэрыторыях чыгуначных станцый, прызначаных для абслугоўвання пасажыраў чыгуначнага транспарту агульнага карыстання.

### ЗА ТРЫ МЕСЯЦЫ — ЗВЫШ 1260 ПРАВАПАРУШЭННЯЎ

У адпаведнасці з артыкулам 19.9 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню ў месцах, дзе яны ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі забаронены, прыводзяць да накладання штрафу ў памеры да чатырох базавых велічынь. На цяперашні момант чатыры базавыя складаюць 148 рублёў.

— За тры месяцы бягучага года супрацоўнікамі органаў унутраных спраў выяўлена звыш 1260 такіх адміністрацыйных правапарушэнняў, з якіх больш як 50 здзейснены непаўналетнімі, — звярнуў увагу Вадзім Петыш. — Дзейнасць супрацоўнікаў міліцыі ў першую чаргу накіравана на прафілактычную працу. З улікам дзеючага заканадаўства, заўважаныя ўпершыню, як правіла, вызваляюцца ад адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненне адміністрацыйнай правінасці з вынясеннем папярэджання. Разам з тым грамадзяне павінны самі разумець, што, запальваючы цыгарэту на лесвічнай пляцоўцы, у ліфце, на прыпынку грамадскага транспарту ці ў скверы, яны ствараюць нязручнасць і вымушаюць дыхаць дымам іншых людзей, у тым ліку пажылых, хворых і дзяцей. Згодна з Правіламі продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання, асобам, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, забараняецца продаж тытунёвых вырабаў і вадкасцяў для электронных сістэм курэння. Аб гэтым не павінны забываць службовыя асобы і работнікі гандлёвых аб'ектаў.

Нагадаем, інфармацыя аб забароне продажу асобных тавараў непаўналетнім асобам размяшчаецца ў месцах продажу гэтых тавараў. Пры ўзнікненні спрэчкі прадавец мае права запатрабаваць у пакупніка дакумент, які змяшчае дату нараджэння, фотамалюнак (лічбавы фотапартрэт) і дазваляе ўстанавіць узрост пакупніка. У выпадку адсутнасці дакументаў, што пацвярджаюць асобу, прадавец мае права не адпускаць пакупніку тавары, продаж якіх непаўналетнім асобам забаронены.

Як паведамілі ў МУС, за парушэнне парадку ажыццяўлення гандлю і грамадскага харчавання, аказання паслуг насельніцтву, рэалізацыі тавараў фізічнымі асобамі ў бягучым годзе да адміністрацыйнай адказнасці за продаж алкагольных, слабаалкагольных напіткаў, піва, тытунёвых вырабаў, электронных сістэм курэння, вадкасцяў для электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню непаўналетнім прыцягнута амаль 160 работнікаў гандлю.

Будзьце пільныя!

# КАЛІ ГАСПАДАРА НЯМА ДОМА...

## Як зберагчы маёмасць ад злодзеяў?

**З надыходам вясенне-летняга перыяду аператыўная абстаноўка ў краіне, як правіла, характарызуецца павелічэннем фактаў крадзяжоў на тэрыторыі сельскай мясцовасці. Асабліва тое актуальна для садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў, дзе зарэгістравана вялікая колькасць домаўладанняў, прызначаных для часовага пражывання грамадзян.**

У бягучым годзе зарэгістравана звыш 220 крадзяжоў, здзейсненых з домаўладанняў грамадзян, якія размешчаны ў садаводчых таварыствах і дачных кааператывах. Прадукты харчавання, адзенне, інструменты, бытавая тэхніка — далёка не поўны спіс таго, дзеля чаго людзі ідуць на злачынства.

На дадзены момант падазравання ва ўчыненні злачынства ўстаноўлены толькі ў 142 выпадках. Як паведаміў **намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС падпалкоўнік міліцыі Васіль ГЕРАСІМАЎ,** складанасць раскрыцця крымінальна каральных дзеянняў гэтага віду заключаецца ў тым, што ў большасці выпадкаў з моманту ўчынення злачынства і да яго выяўлення праходзіць працяглы час, у сувязі з чым даволі складана ўстанавіць тыя ці іншыя абставіны здзяйснення супрацьпраўнага дзеяння.

Пытанні папярэджання ўчыненняў крымінальных дзеянняў дадзенай катэгорыі не страчваюць сваёй актуальнасці. Супрацоўнікамі органаў унутраных спраў на пастаяннай аснове ажыццяўляецца работа па прафілактыцы злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў, якія здзяйсняюцца на тэрыторыях садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў.

Як заўважыў Васіль Герасімаў, найбольш праблемным перыядам з'яўляецца міжсезонне, калі абсалютная большасць дачнікаў перастае наведваць свае домаўладанні. «Наяўнасць у іх матэрыяльных каштоўнасцяў (інструменту, аўдыё- і відэатэхнікі, прадуктаў харчавання і іншага) і адсутнасць для зламыснікаў сур'ёзных перашкод для ўчынення крадзяжоў з'яўляюцца перадумовай злачынных замахаў», — удакладніў ён.



У сувязі з гэтым органы унутраных спраў рэкамендуюць грамадзянам прымаць комплексныя меры для захаванасці сваіх домаўладанняў і маёмасці, якая ў іх знаходзіцца. У прыватнасці, з мэтай павышэння абароненасці свайго дома варта ўстанавіць надзейныя ўваходныя дзверы і замкі, умацаваць аконныя праёмы. Нават калі выходзіце з дому на непрацяглы час, заўсёды правярайце, ці ўсе дзверы і вокны зачыненыя. Ключы ад дома не хавайце пад дыванком каля дзвярэй або ў іншым лёгкадаступным месцы.

— Не пакідайце ў дачным доме ў перыяд міжсезоння або падчас працяглай адсутнасці дарагія рэчы, — звяртае ўвагу намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС. — Па магчымасці забярыце іх да сябе па месцы сталага жыхарства або прыбярыце ў цяжкадаступнае месца. Усталюйце добрасуседскія адносіны з жыхарамі свайго садаводчага таварыства (дачнага кааператыва) з мэтай узаемнага назірання за домаўладаннямі адзін аднаго. Калі кудысьці з'язджаеце, папрасіце суседзяў перыядычна правяраць цэласнасць дзвярэй і вокнаў хаты. Пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці ўстанавіце ахоўную сігналізацыю і не забывайце яе ўключаць.

І яшчэ вельмі важная дэталь. Калі вы заўважылі з'яўленне (пражыванне) старонніх асоб на тэрыторыі садаводчага таварыства (дачнага кааператыва) або ведаеце аб здзейсненых правапарушэннях там, неадкладна праінфармуйце аб тым органы ўнутраных спраў. Гэта датычыцца і з'яўлення транспартных сродкаў, якія выклікаюць падазрэнне. Своечасовае прынясце папераджальных мер дапаможа грамадзянам не толькі абараніць сваю маёмасць ад злачынных замахаў, але і ў выпадку здзяйснення злачынства прыцягнуць вінаватага да ўстаноўленай заканадаўствам адказнасці.

**Фота з адкрытых крыніц.**

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

# Новыя працоўныя месцы патрабуюць выканання новых функцый

**Валерый ГАЛУБОЎСКІ, рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт:**



— У Пасланні беларускаму народу і парламенту Прэзідэнт канкрэтна абазначыў існуючую сітуацыю ў свеце і фактары ўплыву на эканамічны і тэхналагічны суверэнітэт як унутры краіны, так і за яе межамі.

Адным з унутраных фактараў, якія забяспечваюць устойлівае развіццё, з'яўляецца эканамічная эфектыўнасць, у аснове якой — тэхналагічная дысцыпліна, максімальная загрузка вытворчых магутнасцяў прадпрыемстваў і выпуск інавацыйнай і канкурэнтнай прадукцыі на сусветных рынках. Разумеючы, што без кадраў адпаведнай кваліфікацыі зрабіць гэта немагчыма, Прэзідэнт агучыў прамыя даручэнні аб кансалідацыі работы прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі і адукацыі.

Ён падкрэсліў, што толькі заказчыкі кадраў ведаюць, хто патрабуецца для развіцця галіны і нават падказаў работадаўцам, які спецыяліст ім патрэбны для вырашэння задач ва ўмовах інавацыйных і высокатэхналагічных вытворчасцяў. Гэта работнік новага тыпу, адукаваны і ініцыятыўны, гатовы жыць і працаваць у адкрытым інфармацыйным грамадстве. У гэтым моманце трэба ўспомніць аб даручэнні Прэзідэнта — ствараць у кожным рэгіёне краіны новыя працоўныя месцы па прынцыпе «адзін раён — адзін інвестыцыйны праект». Мы ж разумеем, што новыя працоўныя месцы патрабуюць выканання новых функцый. Значыць, у кожным рэгіёне краіны важна ўдзяляць увагу і забяспечваць падтрымку тых вядучых устаноў адукацыі і вучэбна-метадычных цэнтраў прафесійнай адукацыі, якія будуць кансалідаваць узаемадзеянне заказчыкаў кадраў з каледжамі па пытаннях вызначэння запатрабаваных і перспектыўных кампетэнцый на рэгіянальным рынку працы, аператыўна ўносіць змены ў навучальныя планы і праграмы падрыхтоўкі рабочых кадраў і арганізоўваць адукацыйны працэс з выкарыстаннем рэсурсаў цэнтраў кампетэнцый, у якіх прадстаўлены тэхналогіі, што пакуль яшчэ адсутнічаюць на большасці прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі.

Магчымасці ў краіне для вырашэння гэтых задач ёсць, неабходна рацыянальна і эфектыўна выбудаваць работу і, як сказаў кіраўнік дзяржавы, выкарыстаць патэнцыял ініцыятыўных кіраўнікоў з нестандартным мысленнем, нацэльваючы іх на канкрэтныя выгады ў інтарэсах дзяржавы.

# Фінансавы дабрабыт, кантракты, жыллё...

## ПРАВАВАЯ ПАДТРЫМКА

— Паспяховая абарона правоў і законных інтарэсаў членаў прафсаюза шмат у чым залежыць ад таго, наколькі эфектыўна мы працуем у прававым полі. Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі ўвесь час прымаюцца меры, накіраваныя на ўдасканаленне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы і механізмаў работы з грамадзянамі па разглядзе зваротаў. Намі ў гэтым напрамку зроблена шмат, — падкрэсліла прафсаюзны лідар. — Арганізоўвалася навучанне, публікаваліся артыкулы па пытаннях заканадаўства аб працы, даваліся кансультацыі на асабістым прыёме, па тэлефоне, у ходзе работы прамых ліній, круглых сталоў, аказвалася дапамога ў складанні дакументаў для падачы ў суд, забяспечвалася абарона ў судзе правоў і законных інтарэсаў членаў прафсаюза. **Мы аднавілі на рабоце 10 педагагічных работнікаў. Можа, лічба і невялікая, але за ёй — дзесяць людскіх лёсаў.**

Летась прафсаюзам і яго арганізацыйнымі структурамі ажыццяўляўся грамадскі кантроль у больш як 11 тысячах арганізацый. Выяўлена больш як 11,5 тысячы парушэнняў. Дзякуючы рабоце прававых інспектараў прафсаюза работнікам галіны вярнулі амаль 150 тысяч рублёў.

І ўсё ж, нягледзячы на сур'ёзную працу, якую праводзіць прафсаюз, **за 2022 год у наш адрас паступіла амаль на 800 зваротаў больш у параўнанні з 2021 годам. Павялічылася колькасць пытанняў па аплаце і стымуляванні працы, ахове працы.**

Тацццяна Якубовіч праінфармавала, што найбольшая колькасць выяўленых парушэнняў заканадаўства аб працы тычылася калектыўна-дагаворнай работы, парадку ўзгаднення лакальных прававых актаў, заключэння, прадаўжэння і скасавання працоўных дагавораў, кантрактаў, вядзення кадравай дакументацыі і іншых.

Летась сумесна з ФПБ Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі ўдзельнічаў у разглядзе 140 праектаў нарматыўных прававых актаў, у тым ліку накіраваных на прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць са зменамі ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

— Сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі мы выступілі супраць унясення ў заканадаўства норм, якія прадугледжваюць скарачэнне тэрмінаў папярэджання работнікаў аб змяненні істотных умоў працы (да 7 каляндарных дзён), а таксама павелічэння гранічных тэрмінаў пераводу работнікаў на іншую работу або да іншага наймальніка (да 1 года) без яго згоды і значнага павелічэння максімальнай нормы звышурочных работ. Не падтрымалі ўстанаўленне адміністрацыйнай адказнасці работнікаў за работу без заключэння працоўнага дагавора, паколькі афармленне працоўных адносін з'яўляецца абавязкам наймальніка. Патрабаванне аб абавязковай выплаце падаходнага падатку з усіх выплат і падарункаў, якія работнікі атрымліваюць ад прафсаюзных арганізацый, мы таксама не падтрымалі, — канстатавала Тацццяна Якубовіч. — **На жаль, пакуль не знайшлі падтрымкі нашы прапановы ў частцы павелічэння асноўнага водпуску асобным катэгорыям работнікаў.** На падставе вышэйсказанага лічу, што нам неабходна пашырыць практыку выкарыстання прамых тэлефонных ліній, рэгулярнага правядзення выязных асабістых прыёмаў грамадзян, сустрэч з калектывамі, прэс-канферэнцый па актуальных пытаннях, абмеркавання на інтэрнэт-сайтах найбольш значных праектаў нарматыўных прававых актаў, у тым ліку з прыцягненнем прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Неабходна на перыядычнай аснове аналізаваць якасць і колькасць скаргаў, якія паступілі, і прымаць меры па павышэнні эфектыўнасці іх разгляду. На жаль, у нас ёсць хоць і адзінкавыя, але паўторныя звароты нашых грамадзян.

## САЦЫЯЛЬНАЕ ПАРТНЁРСТВА

— Кантрактная форма найму важная не толькі як дадатковая крыніца павышэння заработнай платы работнікаў, асабліву значнасць у наш час набывае стабільны псіхалагічны мікраклімат у працоўных калектывах і выключэнне ў іх сацыяльнай напружанасці, — падкрэсліла старшыня галіновага прафсаюза. — Мы неаднаразова адзначалі, што яшчэ сустракаюцца кантракты, якія патрабуюць больш прынцыповай пазіцыі як з боку кіраўнікоў арганізацый галіны, так і з боку кіраўнікоў арганізацый прафсаюза па напаўненні іх дадатковымі мерамі стымулявання працы.

«Мы бачым, як многія народы ў сучасным свеце змагаюцца за сацыяльна-арыентаваную эканоміку, бясплатную адукацыю і медыцыну, за тое, да чаго мы ўжо прывыклі па працягу шэрагу дзесяткаў гадоў. У сувязі з гэтым на аснове паслядоўнай і мэтанакіраванай работы прафсаюза значную ролю займаюць пытанні сацыяльнага партнёрства. Тэрмін «сацыяльнае партнёрства», якім сёння прынята называць узаемадзеянне ўлады і прафесійных саюзаў, — не проста гучнае азначэнне, а добра адпрацаваная практыка сумеснага вырашэння многіх актуальных пытанняў, — падкрэслівае Тацццяна Якубовіч. — Стан калектыўна-дагаворнай работы ў арганізацыях прафсаюза сістэматычна аналізуецца і разглядаецца на пасяджэннях кіруючых органаў, у працэсе чаго адзначаецца станоўчая тэндэнцыя па ўключэнні норм, якія паляпшаюць прававое становішча работнікаў — членаў нашага прафсаюза ў параўнанні з заканадаўствам. Падвядзенне вынікаў іх выканання, недапушчальнасць выключэння асобных норм і ў цэлым якасць калектыўных дагавораў, пагадненняў павінны быць пад пастаянным нашай увагай».

## ВЫПЛАТА ЗАРОБКАЎ — НА КАНТРОЛІ

Адно з самых актуальных пытанняў для работнікаў адукацыі — зарплаты. Летась шэсць разоў пераглядаўся памер базавай стаўкі, якія прымяняецца для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. З 1 студзеня бягучага года яе памер складае 228 рублёў (рост да студзеня 2022 года — 110,1 працэнта).

— Паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, як і ў мінулым годзе, павышэнне базавай стаўкі ў 2023 годзе будзе ажыццяўляцца ў некалькі этапаў, у сувязі з чым яе сярэднегадавое значэнне павялічыцца на 10 працэнтаў, — праінфармавала Тацццяна Якубовіч. — Прынятыя летась змяненні і дапаўненні ў пастанову Міністэрства адукацыі нумар 71 таксама накіраваны на павышэнне заработнай платы. Прафсаюзам праводзілася тлумачальная работа па пастанове Міністэрства адукацыі № 461, была арганізавана «гарачая лінія» па пытаннях аплаты працы ў працоўных калектывах.

**Аналіз зваротаў сведчыць аб некаторай напружанасці асобных катэгорый работнікаў (настаўнік-дэфектолаг, педагог-псіхолаг устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, выхавальнік, памочнік выхавальніка ўстаноў, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі) у частцы нераспаўсюджвання на іх надбаўкі за работу ў галіне. Гэта пытанне ўжо абмяркоўвалася на ўзроўні Міністэрства адукацыі, яно патрабуе прыняцця ў далейшым узважанага рашэння.**

У 2022 годзе намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў арганізацый краіны склала 1630,9 рубля. Сярэдняя заработная плата работнікаў галіны адукацыі за студзень—снежань 2022 года склала 1115,8 рубля. «Безумоўна, мы разумеем, што трэба далей працаваць ва ўзаемадзеянні з сацыяльнымі партнёрамі ў частцы паэтапнага дасягнення паказчыкаў па павышэнні заработнай платы работнікаў галіны. Планы, запісаныя ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны да 2025 года, мы абавязаны выканаць», — дадала Тацццяна Якубовіч.

Старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі запэўніла, што пытанні своечасовай выплаты заработнай платы і поўнай занятасці работнікаў знаходзяцца на пастаянным прафсаюзным кантролі. Вынікі праведзеных маніторынгаў сведчаць аб адсутнасці ў 2022 годзе фактаў парушэнняў тэрмінаў выплаты заработнай платы, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі. Фактаў няпоўнай занятасці работнікаў па ініцыятыве наймальніка, прыпынення дзейнасці асобных норм калектыўных дагавораў таксама не ўстаноўлена.

У 2022 годзе спецыялістамі сацыяльна-эканамічных аддзелаў прафсаюза ажыццёўлены грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб працы ў 255 арганізацыях, у ходзе якіх было выяўлена амаль 800 парушэнняў. Дзякуючы прынятым мерам вернута работнікам больш за 400 тысяч рублёў, незаконна ўтрыманых ці несвоечасова выплачаных, што на 52,8 працэнта больш у параўнанні з 2021 годам. Усяго па патрабаванні прафсаюза работнікам было выплачана звыш 752 тысяч рублёў, што на 100 тысяч больш, чым у папярэднім годзе.

Сярод парушэнняў пераважаюць факты невыканання заканадаўства аб працы ў частцы разліку планавага фонду аплаты працы, нявыкарыстаных сродкаў, прадугледжаных на аплату працы. Работа ў гэтым кірунку патрабуе кантролю і пільнай увагі, удзелу з боку арганізацый прафсаюза ўсіх узроўняў.

## САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА

Яшчэ адна актуальная тэма — арганізацыі харчавання работнікаў галіны ў сталовых устаноў адукацыі, яно неаднаразова абмяркоўвалася на пасяджэннях кіруючых органаў прафсаюза і калегіяльных органаў Міністэрства адукацыі.

— Прыемна адзначыць, што на сёння заканадаўцы замацавалі права педагагаў і іншых работнікаў устаноў адукацыі (для нас гэта было прынцыпова) харчавацца ў аб'ектах грамадскага харчавання па месцы іх працы, — падкрэсліла Тацццяна Якубовіч. — Немалаважнае пытанне — забеспячэнне работнікаў галіны жыллём. На пачатак бягучага года на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стаяць амаль 14 тысяч (13 943) работнікаў (з іх 83,5 працэнта — у гарадах і 16,5 працэнта — у сельскай мясцовасці).

У сталічных установах вышэйшай адукацыі у чарзе стаяць амаль 800 чалавек з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, або 10,4 працэнта ад агульнай колькасці.

На працягу 2022 года 810 работнікаў палепшылі жыллёвыя ўмовы ў асноўным шляхам кааператыўнага і індывідуальнага будаўніцтва ці набыцця жылля.

«На жаль, адной з прычын, якая замінае палепшыць жыллёвыя ўмовы (уступіць у долевае будаўніцтва або пабудаваць жыллё ў камерцыйнага забудоўшчыка без прыцягнення льготнага крэдытавання) з'яўляецца невысокі ўзровень заработнай платы педагагічных работнікаў, — канстатавала Тацццяна Якубовіч. — Улічваючы актуальнасць пытання, ёсць неабходнасць яго разгляду сумесна з Міністэрствам адукацыі з мэтай захавання кадравага патэнцыялу і павышэння прэстыжу педагагічнай прафесіі, асабліва для замацавання маладых спецыялістаў, якія адпрацавалі абавязковы тэрмін па размеркаванні ва ўстановах адукацыі. **У нас часта пытаюцца: чаму для медыкаў будуецца арэнднае жыллё, а педагогі такой прывілеі не маюць?»**

Напрыканцы свайго выступлення Тацццяна Якубовіч падзякавала асабіста кожнаму члену прафсаюза і ўсім сацыяльным партнёрам за штодзённую сумесную плённую працу і заўважыла, што «толькі разам мы здольны вырашаць усе пытанні, якія стаяць на парадку дня».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

5 красавіка 2023 г. № 12 (698)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# З ЦЭЛЫМ НАРОДАМ ГУТАРКУ ВЕСЦІ

## Пасланне Прэзідэнта народу і парламенту глядзелі і працягваюць абмяркоўваць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі






Фота БелТА.

**Пасланне кіраўніка дзяржавы сёлета выклікала асаблівы інтарэс у беларусаў. Яно і зразумела: калі вакол напружаная няпростая сітуацыя, вельмі важна пачуць, што скажа лідар краіны, які не толькі валодае гэтай самай сітуацыяй лепш за ўсіх, але і ведае, што рабіць далей, каб жыць у міры і дабрабыце. Тэлеграм-канал «Пул першага» апублікаваў інфармацыю, паводле якой сёлета ў параўнанні з мінулым годам прамую трансляцыю і тэлеверсію звароту Прэзідэнта пагледзелі на 490 тысяч чалавек больш — агулам 2 мільёны 125 тысяч чалавек.**

**У гэтым нумары «МС» мы сабралі каментарыі тых, хто мае непасрэднае дачыненне да мясцовага самакіравання — ад сенатараў да дэпутатаў сельскіх Саветаў.**

## КАЛІ ГАВОРЫЦЬ ПРЭЗІДЭНТ, ГЭТА ДАКЛАДНА ВЫВЕРАНАЯ СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу (у эфіры тэлеканала «Беларусь 1»):**

— Гэта было моцнае выступленне Прэзідэнта, дзе кожны знайшоў адказы на тыя пытанні, якія яго хвалявалі. І чарговы раз кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што, калі б не было 2020 года, яго сапраўды трэба было б прыдумаць, каб убачыць, хто ёсць хто і ці правільна мы развіваемся ў эканоміцы, у сацыяльным напрамку ў нашай краіне. І мы бачым, што наша палітыка абсалютна апраўданая.

Чарговы раз прагучала ініцыятыва Прэзідэнта па мірных пагадненнях ва Украіне. Кожны нармальны чалавек жадае жыць у мірнай краіне. Наша палітыка міралюбівая. Тыя прапановы, якія неаднаразова выказвае Прэзідэнт нашай краіны («Хельсінкі-2», мірныя ініцыятывы), заўсёды накіраваны на стваральную працу, захаванне міру. І да гэтага трэба прыслухацца. Мы ў сваёй краіне неаднаразова пераконваліся ў тым, што калі гаворыць Прэзідэнт, то гэта дакладна выверaная стратэгія, дакладна выверaная тактыка. І трэба было б прыслухацца ўсім да таго, каб захаваць мір не



Фота БелТА.

толькі ў канкрэтна ўзятай краіне асобна, але і ва ўсім свеце. Гэта самае галоўнае сёння для ўсёй сусветнай супольнасці...

Перш за ўсё для нас галоўнае эканоміка. Будзе эканоміка — усё астатняе будзе складацца ўдала. І таму тыя задачы, якія былі пастаўлены Прэзідэнтам па імпартазамяшчэнні, адкрыцці новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў у кожным раёне, кожным горадзе, — гэта ж задачы не сённяшняга і нават не ўчарашняга дня. Аб гэтым Прэзідэнт гаварыў даўно — што трэба мець свае вытворчасці, прадпрыемствы, свае тэхналогіі, навуку для таго, каб мы маглі жыць так, як лічым патрэбным. І, акрамя таго, каб маглі развівацца.

Мы бачым, што эканоміка паказвае тое, што мы сёння можам спакойна жыць і працаваць. У нас дастаткова працоўных месцаў. У нас людзі сёння, якія жадаюць зарабіць, могуць працаваць. Калі ласка, працуйце на прадпрыемствах, у арганізацыях — ёсць працоўныя месцы. Адкрыты магчымасці для пастаўкі сваёй прадукцыі на экспарт. І, вядома, мы павінны захаваць усё тое, што ў нас было, усе нашы вытворчасці і прадпрыемствы. Таму ў эканоміцы пытанне нумар адзін — гэта стварэнне новых тэхналогій і вытворчасцяў, імпартазамяшчэнне. Тое, аб чым гаворыць Прэзідэнт. І, канешне, гэта эфектыўная работа нашых прадпрыемстваў...

Я думаю, што сёння ўжо шмат хто ўсвядоміў, што наш беларускі рубель — сапраўды добрая валюта для нас, беларусаў. І я думаю, што няма сёння неабходнасці бегчы ў абменнікі. І гэта адчулі нашы людзі. Ну хто сёння гаворыць аб тым, што ім не хапае долараў або еўра? Усе думаюць аб тым, як зарабіць свой беларускі рубель, каб жыць нармальна ў сваёй краіне. А для гэтага ў Беларусі створаны ўсе ўмовы, каб вучыцца, працаваць, нараджаць дзяцей, адпачываць.

стар. 8–9

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Трыядзінства навукі, культуры і адукацыі

### прадстаўнік Беларусь на X Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Работа секцыі «Гуманітарнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Вынікі дзесяцігоддзя і перспектывы развіцця», якая пройдзе ў межах юбілейнага мерапрыемства, — гэта магчымасць яшчэ раз абмеркаваць пытанні, што назапасіліся за гэты час, а таксама вызначыць новыя перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва, упэўнена **Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці,** якая расказала, што мае адбыцца падчас секцыі.

Мяркуецца, што ўдзел у рабоце секцыі возьмуць да 120 чалавек. З боку Беларусі — гэта прадстаўнікі Мінадукацыі, Мінкульта, НАН Беларусі, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях, маладыя парламентарыі і сенатары.

— За час супрацоўніцтва было зроблена шмат. Толькі па лініі Міністэрства адукацыі Беларусь узаемадзейнічае з 80 рэгіёнамі Расіі. У асноўным гэта міжуніверсітэцкае супрацоўніцтва (больш за 1200 дагавораў). Аднак, пэўна, настаў час яшчэ раз перагледзець мерапрыемствы, якія былі вызначаны ў рамках пагаднення раней, і, магчыма, падумаць пра новыя кірункі і формы работы, — расказала Ірына Старавойтава.

У сферы культуры найбольш яркімі прыкладамі работ у межах Саюзнай дзяржавы (СД) сталі праекты, рэалізаваныя за агульныя сродкі: «Ржэўскі мемарыял Савецкаму салдату» і рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць».

Традыцыйнымі формамі супрацоўніцтва сталі канферэнцыі: навукова-практычныя і навукова-метадычныя, форумы, семінары. У рамках праекта «Запрошаны прафесар» расійскія вучоныя могуць чытаць лекцыі ў беларускіх універсітэтах і наадварот. Ёсць пагадненне для сумеснай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі. Звыклай тэмай стала і абмеркаванне пытанняў, якія датычацца маладзёжнай палітыкі. Штогод праводзіцца грамадзянска-патрыятычная кадэцкая змена навучэнцаў Саюзнай дзяржавы «За гонар Айчыны». А летась упершыню быў распачаты праект «Цягнік памяці», які будзе рэалізаваны сёлета, заўважыла сенатар:

— Наша агульная задача — сфарміраваць у моладзі імператывы, якія базіруюцца на нашай агульнай памяці, што з'яўляецца цэментуючай асновай нашага сяброўства, сумесных прыярытэтаў і далейшай работы.

Датычна навукі на секцыі будуць абмяркоўвацца ўжо рэалізаваныя прыярытэтныя кірункі і шляхі, якімі неабходна рухацца далей. Ёсць актуальныя пытанні імпартазамяшчэння, у прыватнасці новыя навуковыя распрацоўкі па мікраэлектроніцы. Вельмі важнае для абедзвюх краін і пытанне інтэграцыі навуковых распрацовак у сферы эканомікі і ў вытворчую сферу ўзаемадзеяння. Ірына Старавойтава падкрэсліла, што карысць рэалізацыі сумесных праектаў СД у розных сферах і неабходнасць яе павелічэння не выклікае сумневу, і гэта вельмі важна для ўмацавання эканомікі і агульных падыходаў фарміравання маладзёжнай палітыкі.

**Ірына СІДАРОК.**

*Падрабязней пра работу, якая плануецца ў рамках секцыі, «Звязда» раскажа ў наступным нумары «МС».*

# З ЦЭЛЫМ НАРОДАМ

## ТРЭБА БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

**Алег ДЗЯЧЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі:**



— У сваім звароце да суайчыннікаў Прэзідэнт Беларусі вызначыў шэсць асноўных умоў захавання суверэнітэту і незалежнасці. Адна з іх — гістарычная памяць і нацыянальныя традыцыі. Вельмі сур'ёзная і глыбокая тэма. Парадыгма відавочная — без захавання нацыянальнай ідэнтычнасці немагчыма якасна забяспечыць нацыянальны суверэнітэт і незалежнасць. У сувязі з гэтым беларускі нацыянальны лідар правільна і своечасова ўзняў пытанне аб паэтапным культурным «імпартазамяшчэнні».

Давайце ўспомнім, з чым мы сутыкнуліся ў свой час? З падачы празаходніх палітычных эліт у свядомасць беларусаў маштабна запампоўваліся найгоршыя ўзоры заходняй масавай культуры. Культ гвалту і гандлю людзьмі, прапаведаванне нетрадыцыйных шлюбаў, прапаганда прымітыўных інстынктаў, нораваў крымінальнага свету і «дна» грамадства абрынуліся на людзей. У выніку адбывалася размыванне духоўных каштоўнасцяў, якія ствараліся нашым народам стагоддзямі. Фактычна знішчаліся нацыянальныя традыцыі. Але ж час змяніўся і беларуская дзяржава, дзякуючы Прэзідэнту нашай краіны, спыніла гэтыя дэструктыўныя працэсы.

На маю думку, сёння нам трэба больш увагі аддаваць папулярызацыі традыцыйных беларускіх свят, такіх як Каляды, Дзяды, Радаўніца, Купалле, рэгіянальных народных фестываляў творчасці кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў і паэтаў, шэдэўраў народнай і царкоўнай архітэктуры, адным словам, усяго таго, што было створана за тысячагадовы перыяд беларускай дзяржаўнасці.

Ды і сучаснае культурнае жыццё Беларусі вызначаецца дынамічнасцю і разнастайнасцю, самабытнасцю і арыгінальнасцю. Паглядзіце, колькі сёння праводзіцца мастацкіх выставак, музычных, тэатральных і кінематаграфічных фестываляў, як выбудавана сістэма культурнай сацыялізацыі насельніцтва. Усё гэта неабходна несці, як той казаў, у масы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на новую тэндэнцыю ў грамадстве: «Расце попыт на айчыннае, народнае. Прычым датычыцца гэта не толькі мерапрыемстваў. Людзі жадаюць бачыць не імпартаваныя, а створаныя ў сваёй краіне вобразы ва ўсім, пачынаючы ад упакоўкі прадукцыі і заканчваючы інтэр'ерным афармленнем гарадской інфраструктуры».

Вось над гэтым і трэба ўсім нам актыўна працаваць. І ад нас цяпер будзе залежаць, наколькі эфектыўна мы зможам «прашыць» грамадскую свядомасць, найперш моладзі, нацыянальным беларускім культурным кодам.

## СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ НАШАЙ КРАІНЫ І НАСТОЛЬНАЯ КНІГА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**



— Галоўны пасыл, які я адназначыла б у Пасланні Прэзідэнта, датычыцца народнага адзінства як першай умовы захавання незалежнасці і суверэнітэту. Калі ў папярэднім Пасланні прагучалі пытанні накont таго, ці гатовыя мы плаціць за суверэнітэт, цяпер пытанне ў тым, што мы зрабілі для таго, каб яго замацаваць.

Была звернута ўвага на канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, на захаванне гістарычнай памяці і данясенне праўды да маладога пакалення. І тут важнае месца належыць дэпутацкаму корпусу. Мы бачым гэта, рэалізоўваючы ў рэгіёне некалькі праектаў дадзенага кірунку. А моладзь, трэба сказаць, у нас цудоўная. У маладых людзей шмат ідэй, варта толькі накіроўваць іх у правільнае рэчышча.

Відавочна, што ў сістэме адукацыі будзе праведзена адпаведная работа, перагледжана праграма, вучэбныя дапаможнікі. Варта звярнуць увагу на работу акрэдытаваных тураператараў, якія павінны правільна даносіць гістарычную праўду, не скажаць факты, што ўплываюць на фарміраванне свядомасці нашых грамадзян, асабліва маладых людзей. Разам з тым, як адзначыў Прэзідэнт, не варта займаць агрэсіўную пазіцыю ў адносінах да нашых заходніх суседзяў, трэба ствараць умовы для выхавання патрыётаў сваёй краіны праз сучасныя дасягненні і гістарычна-культурную спадчыну. І такіх прыкладаў нямала. Узяць хоць бы маштабную выстаўку «Беларусь інтэлектуальная», якая з поспехам прайшла праз усе рэгіёны краіны і прадэманстравала высокі ўзровень беларускай навукі.

Адзначыла для сябе і такі тэзіс у Пасланні, як «культурнае імпартазамяшчэнне». Згодная, што гэта павінна стаць трэндам для ўсіх вытворцаў. Чаму б не адзначаць на ўпакоўцы беларускіх тавараў нейкую эмблему, слоган, які б не толькі вызначаў айчыннага вытворцу, але і заклікаў падтрымліваць свае прадпрыемствы? Магчыма, гэта будзе нейкі нацыянальны арнамент ці сімвал. Каб беларус усведамляў, што пры куплі беларускага тавару ён уносіць свой уклад у развіццё эканомікі, бо эканоміка — гэта таксама гарант міру і бяспекі.

Важнае значэнне ў Пасланні было нададзена рабоце з сем'ямі, у тым ліку шматдзетнымі. Падтрымка дзяржавы ў дадзеным аспекце калясальная. І тут я работу дэпутацкага корпуса бачу ў тым, каб такая падтрымка дайшла да кожнага дзіцяці, таму што ўсе рашэнні па накіраванні грашовых сродкаў і выплат прымаюцца таксама і дэпутатамі. Яны і павінны разабрацца, як гэтыя сродкі размяркоўваюцца ў сям'і, ці ідуць яны па прызначэнні.

Як адзначалася ў Пасланні, чалавек працы — галоўная каштоўнасць грамадства. Кожны, хто працуе, можа зарабіць. І наш аблсавет у сувязі з гэтым распачынае праект, які прапанаваны Саветам ветэранаў. Сэнс такі — ідэаламі для моладзі павінны стаць людзі працы, якія ўсё жыццё прысвяцілі служэнню народу. У хуткім часе мы збяром такіх людзей, якія маюць дзяржаўныя ўзнагароды за працу ў розных сферах. І першым нашым госцем будзе былы намеснік старшыні аблвыканкама Марыя Бірукова.

Што датычыцца рэгіянальнага развіцця, тут Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на дэурбанізацыю. Людзі ў горадзе і ў сельскай мясцовасці павінны жыць у аднолькава камфортных умовах, мець якасны ўзровень жыцця — ад дарожнай інфраструктуры да забеспячэння таварамі і паслугамі. Вядома, трэба ўлічваць і запатрабаванасць гэтых паслуг, іх эканамічную абгрунтаванасць. У дадзеным кірунку важна развіваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства з прыцягненнем насельніцтва. Напрыклад, да добраўпарадкавання сваіх падворкаў, тэрыторый, дарог, населеных пунктаў. Дзяржава стварае пэўныя ўмовы, але камфорт залежыць ад саміх жыхароў, наколькі яны гатовыя яго забяспечыць. Цяпер мы чакаем выхад Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», у якім будзе раздзел і па грамадзянскіх ініцыятывах. Такі вопыт у Гродзенскай вобласці ёсць. У нас рэалізавана 14 праектаў, мы падвялі вынікі і ўзнагародзілі найлепшых. Дзякуючы жыхарам і спонсарам мы ў 2,5 раза дапоўнілі той бюджэт, які быў выдзелены Банкам развіцця.

Перашкод для развіцця няма. Паміж уладай і насельніцтвам выбудавана пэўная сувязь, працуюць саветы па міжведамасным узаемадзеянні, мы вядзём дыялог з месцаў аб унясенні змяненняў у чарговыя нарматыўныя акты. Зніжаецца і колькасць зваротаў грамадзян, што сведчыць аб пазітыўнай сітуацыі на месцах. Мы здольныя пераадолець выклікі санкцый. Самае галоўнае — каб быў мір на нашай зямлі!

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## ПАСЛАННЕ — МАРШРУТНАЯ КАРТА ДЛЯ КОЖНАГА

**Віктар ДАРОЖКІН, старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў:**



— Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь народу — гэта карта, на аснове якой кожны чалавек на месцы павінен скласці свой маршрут і працаваць на карысць краіны.

Сучасны рытм жыцця патрабуе ад любога чалавека ледзь не штохвілінна прымаць важныя рашэнні, але трэба абавязкова думаць аб іх наступствах. І калі пры гэтым кожны — вучань, кіраўнік арганізацыі, дзяржаўны служачы на сваім працоўным месцы — стане добрасумленна выконваць ускладзеныя на яго абавязкі, а дзесьці навat ісці з апярэджаннем, можна будзе казаць пра тое, што пасыл Прэзідэнта прыняты і мы разам працуем над яго рэалізацыяй.

Лейтматывам Паслання беларускага лідара сталі ўмовы захавання суверэнітэту і незалежнасці ў цяжкай знешнепалітычнай сітуацыі. На сённяшні дзень зроблена шмат у сферы ваеннай падрыхтоўкі, мы гатовыя стаць на абарону сваёй Айчыны, калі над нашымі нацыянальнымі каштоўнасцямі павісне рэальная пагроза. Аднак супрацьстаяць агрэсарам мы зможам толькі разам, захаваўшы такое дарагое для нас паняцце народнага адзінства.

Беларусы як ніхто іншы ведаюць, наколькі мір з'яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю, здабытай у мінулым стагоддзі неймавернай цаной. Мільёны нашых суайчыннікаў, якія былі сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны, аддалі свае жыцці дзеля Перамогі. Дзеля свабоды і незалежнасці, каб мы з вамі сёння змаглі пабудаваць моцную і міралюбівую дзяржаву. Больш за 80 гадоў таму захопнікі не змаглі зламаць наш моцны нацыянальны дух, таму вельмі важна, каб, грунтуючыся на горкіх уроках мінулага, мы заставаліся адзінымі і сёння ў нялёгкіх палітычных умовах. Генетычная памяць беларусаў — гэта самая моцная зброя.

Але не толькі аб праблемах знешняй і ўнутранай палітыкі гаварылася ў Пасланні Прэзідэнта. Не засталіся без увагі эканоміка, сацыяльная сфера, многія штодзённыя, бытавыя пытанні, якія хвалююць кожнага. У прыватнасці, беларускі лідар заявіў: «Усе рашэнні па рэгуляванні цэн прынятыя. Так, яны жорсткія. Вы ведаеце мой прынцыповы падыход: нікому не дазволена беспадстаўна павышаць цэны і абіраць людзей».

На тэрыторыі Віцебскай вобласці многія грамадскія арганізацыі, у тым ліку прафсаюзы, праводзяць пастаянны маніторынг гандлёвых сетак, каб не дапусціць неапраўданага росту цэн для атрымання кімсьці звышпрыбытку. Акрамя таго, у насельніцтва заўсёды ёсць магчымасць патэлефанаваць і паведаміць аб падобных фактах. Але не кантроль з'яўляецца асноўнай задачай.

Наша краіна сёння мае багаты перадавы вопыт у аграрнай галіне, паўсюль паспяхова працуюць аграпрамысловыя холдынгі, на жывёлагадоўчых комплексах аўтаматызуецца вытворчы працэс. Шмат што зроблена, і ў гэтым наша перавага, аднак самае галоўнае — ствараць айчынную прадукцыю ў дастатковай колькасці, захаваць і прапанаваць яе беларусам па тым кошце, які сустаўны з заробкам.

Прэзідэнт на сённяшні дзень зрабіў самае важнае — захаваў мір. Наша задача цяпер — развіваць эканоміку, працаваць з поўнай аддачай, каб разам ствараць лепшую будучыню.

# ГУТАРКУ ВЕСЦІ

## Моцная сям'я — моцная дзяржава

**Аксана ЮРКОЎСКАЯ, старшыня Ружанскага сельскага Савета Пружанскага раёна:**



— У Пасланні мяне асабліва ўсхвалявала тэма сям'і, дэмаграфічнай бяспекі краіны. «Нас, беларусаў, павінна быць больш, — сказаў Прэзідэнт краіны. — Гэта найважнейшая ўмова суверэнітэту. І дзяржава шмат робіць, каб гэтую ўмову забяспечыць. У краіне ўчыняецца маштабная падтрымка сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей... А для шматдзетных — асаблівыя ўмовы: жыллё, сямейны капітал, бясплатнае харчаванне ў дзіцячым садку і школе...»

Але сёння нас, як і кіраўніка дзяржавы, хвалюе той факт, што падтрымка ў асобных выпадках можа не даходзіць да свайго адрасата — дзіцяці, якому яна і прызначана. Маецца на ўвазе, што ёсць несамавітыя бацькі, якія жывуць за кошт той падтрымкі ці, яшчэ горш, прапіваюць грошы. І з гэтым, сапраўды, трэба змагацца.

Лічу, што варта стварыць кампетэнтную камісію з ліку парламентарыяў, педагогаў, юрыстаў, а таксама прадстаўнікоў мясцовай улады, каб усебакова разглядзець дадзенае пытанне. Пытанне, дарэчы, не такое простае, як можа падацца на першы погляд, і надзвычай далікатнае. Я ўжо не раз чула прапановы, што дапамога, нават на будаўніцтва жылля, павінна быць адраснай. Маўляў, добрая, станоўчая сям'я — значыць атрымлівай крэдыт з наступным пагашэннем на будаўніцтва кватэры альбо дома. Але ў такім выпадку існуе рызыка суб'ектыўнага падыходу. Падобныя пытанні неабходна вырашаць заканадаўча. А вось нейкім чынам улічваць удзел шматдзетных бацькоў у эканоміцы пры выдзяленні льгот, асабліва на будаўніцтва, думаю, сэнс ёсць.

Адным словам, праблема, з якой сутыкнулася грамадства, няпростая, і яе вырашэнне заклікана мець на мэце найперш стымуляванне сем'яў да нараджэння дзяцей — «нас павінна быць больш». А ў сем'ях павінны расці здаровыя і шчаслівыя дзеці, якія ў будучым возьмуць на сябе клопат пра эканоміку і сацыяльную сферу, пра краіну ў цэлым.

На тэрыторыі нашага сельсавета жыве 101 шматдзетная сям'я, дзе выхоўваецца 343 дзіцяці. Большасць гэтых людзей, нават можна сказаць, абсалютная большасць — цалкам станоўчыя, дружныя сем'і. Бацькі шчыруюць на рабоце і дома, тым самым падаюць добры прыклад дзецям. Ёсць усе падставы чакаць, што іх дзеці вырастуць працавітымі, прыстойнымі грамадзянамі нашай краіны.

Праўда, ёсць і такія, якім патрэбны пастаянны кантроль, напамін пра бацькоўскі абавязак падтрымліваць парадак у доме, клапаціцца пра вучобу і паводзіны дзяцей. Менавіта кантроль, рэгулярныя наведванні прадстаўнікоў адпаведных службаў падтрымліваюць названых шматдзетных бацькоў у пэўнай форме. Сітуацыя ў сем'ях не крытычная, але ж, як ужо гаварылася, патрабуе ўвагі.

За час маёй работы на гэтай пасадзе быў выпадак, калі сямейную пару пазбавілі бацькоўскіх правоў. Здараліся выпадкі, калі дзяцей часова змяшчалі ў прытулак. Цяпер бывае, што дзеці атрымліваюць статус СНС — тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, але апошняе, як правіла, падштурхоўвае бацькоў да выпраўлення. Тым больш што з такімі бацькамі актыўна працуем.

Адной са сваіх задач мясцовая ўлада лічыць работу па ўсебаковым умацаванні сям'і. Мы добра разумеем, што моцная сям'я — залог моцнай дзяржавы.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ТРЭБА БЫЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНЫМІ І АДДАНЫМІ РАДЗІМЕ

**Ларыса ГЕРАСІМАВА, старшыня Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў:**



— Я ўжо не першы раз бяру ўдзел у гэтым маштабным усенародным мерапрыемстве, і сёлета, як заўсёды, усё было шчыра, адкрыта і справядліва. Адна з найважнейшых тэм — яднанне беларускага народа, незалежнасць нашай краіны і суверэнітэт. Сёння вельмі важна захаваць мір і дабрабыт. Гэта блізка і зразумела кожнаму беларусу. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што мы мірныя людзі, але заўсёды гатовыя абараніць сваю краіну, свой народ, дзяцей і ўнукаў. Нашы нашчадкі павінны ведаць гісторыю, быць патрыётамі краіны, любіць Радзіму. І толькі ад нас залежыць, якія яны будуць на самай справе. Мы ўсе зацікаўлены ў тым, каб Беларусь квітнела, жыла ў міры і была незалежнай. Цалкам згодная са словамі Прэзідэнта, які кажа, што кожны мае магчымасць у нашай краіне годна жыць, дастойна працаваць, атрымліваць добрую заробтную плату. І жыццё нават у невялічкім населеным пункце, тым жа аграгарадку, не павінна быць горшае, чым у сталіцы.

Што датычыцца згуртаванасці, магу прывесці прыклад на нашым узроўні. Той жа Беладубраўскі сельсавет, вядомы сваім «гусіным святам», нядаўна ўзяўся за вельмі актуальную ініцыятыву — аднаўленне крыніцы. Яна падобная да вядомай Блакітнай, што ў Слаўгарадскім раёне, але пэўны час не выкарыстоўвалася і прыйшла ў непрыдатны стан. Людзі там ужо правялі тры суботнікі. На аднаўленні крынічкі разам працуюць і мясцовыя жыхары, і старасты, і дэпутаты. Кожны дапамагае, чым можа. Мясцовы майстар, напрыклад, зрабіў лесвіцу, падрыхтаваў масток. Ініцыятыва аб'яднала жыхароў і натхніла.

Згуртоўваюць нас і сумесныя святы. Людзі там адпачываюць ад гаспадарчых спраў, абмяркоўваюць са знаёмымі агульныя тэмы. Падчас такіх мерапрыемстваў узнагароджваюць ініцыятыўных людзей, віншуюць самых маленькіх, сталых, маладыя сем'і. Здаецца, дробязі, але ўсё гэта сапраўды яднае. На дні нараджэння вёсак прыязджаюць людзі з розных куточкаў краіны, якія потым таксама імкнуцца ўдзельнічаць у жыцці сваёй малой радзімы.

## Сумесная праца можа ўсіх згуртаваць

**Сяргей БАГДАНОВІЧ, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Шчомысліца», дэпутат Шчомысліцкага сельскага Савета Мінскага раёна:**



mlyn.by

— У сваім Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што нам трэба асаблівую ўвагу ўдзяліць захаванню і ўмацаванню суверэнітэту і незалежнасці нашай дзяржавы, паколькі мы яшчэ ніколі ў навейшай гісторыі не падыходзілі да такой небяспечнай мяжы.

Зразумела, што мы, работнікі сельскагаспадарчай галіны, таксама ўносім свой уклад у справу захавання незалежнасці. А менавіта ўмацоўваем харчовую бяспеку Беларусі. Сёння ўсе мы павінны аб'яднацца. І толькі сумесная праца можа ўсіх згуртаваць. І кожны добрасумленна робіць сваю справу: жывёлаводы, спецыялісты гаспадаркі, паляводы, механізатары.

Для сельскіх працаўнікоў надыходзіць гарачая пара — пачынаецца пасяўная кампанія. Мы да яе падрыхтаваліся, забяспечаныя ўсім неабходным. Таму што кожны разумее: наш абавязак — выпускаць больш сельгаспрадукцыі, пастаянна паляпшаць яе якасць. Менавіта ад гэтага залежыць харчовая бяспека, а значыць не толькі зарплата і дабрабыт людзей, але і суверэнітэт краіны.

Мы ў пастаянным пошуку новых спосабаў і шляхоў эфектыўнага і выніковага гаспадарання на зямлі. За добрую работу людзі атрымліваюць дастойную зарплату. У калектыве няма цякучкі кадраў. Як толькі з'яўляецца вакансія, яна хутка запаўняецца. Жыць побач са сталіцай і зарабляць не менш, чым у горадзе — такое ёсць далёка не ва ўсіх гаспадарках.

Шмат увагі аддаём і камфортным умовам пражывання нашых работнікаў: будуем жыллё, забяспечваем кватэрамі. Як сказаў кіраўнік дзяржавы ў Пасланні, Мінск — гэта не ўся Беларусь. Кожны рэгіён павінен мець якасную сістэму медыцынскага абслугоўвання, адукацыі, культуры, гандлю. Людзі павінны жыць камфортна ў любым кутку Беларусі.

## СЛОВЫ, ЯКІЯ КРАНУЛІ ЗА ЖЫВОЕ

**Жанна БІЗНЯ, старшыня Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна:**



— Калі слухала выступленне Прэзідэнта, адзначыла для сябе, што яго пасылы — пра будучыню. Мы не стаім на месцы, а будуем, ствараем, забяспечваем дастойнае, бяспечнае, мірнае жыццё ў сваёй суверэннай краіне. Наша сіла ў тым — гэта пацвердзіў і 2020 год, — калі мы як народ адзіныя. Так, могуць быць розныя пункты гледжання на тыя ці іншыя падзеі ў грамадстве, што нармальна. Але мы іх павінны абмяркоўваць на тых жа дыялогавых пляцоўках, сустрэчах, але ні ў якім разе не са зброяй у руках, ні ў якім разе не дэструктыўна. Мы не павінны забываць, што сёння будуем краіну, якую пакінем сваім дзецям. Многія, хто слухаў Пасланне Прэзідэнта, адзначылі адзін з яго пасылаў: «Патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт». Для мяне гэтая фраза звязана не толькі з сям'ёй, але і з грамадствам і нашым Прэзідэнтам асабіста. Як бы ні было цяжка, якія б палітычныя выпрабаванні ні выпалі на шляху Прэзідэнта, ён выдужаў і абараніў усіх нас, як патрыёт працягвае паказваць на сваім прыкладзе, як трэба любіць і берагчы сваю краіну, цаніць тое, што маеш.

У Пасланні Прэзідэнта прагучалі і тыя тэзісы, якія проста кранулі за жывое. Гэта тэма дзяржаўнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Я цалкам згодная з пазіцыяй Прэзідэнта, што калі дзяржава дапамагае, то мае права патрабаваць справаздачы аб тым, куды ў сям'і ідзе тая дапамога і ці на карысць дзяцей? Таму што, на жаль, бываюць такія выпадкі, калі ў сям'і грошы, якія выдзелены як сацыяльная падтрымка на выхаванне, накіроўваюць не заўсёды на мэты развіцця дзіцяці, паляпшэння ўмоў пражывання. І як адзначыў сам Прэзідэнт: не заўсёды прычына такіх сітуацый — толькі п'янства. Часта гэта проста нядбайнае, інфантыльнае, няспелае стаўленне да жыцця, да выхавання сваіх дзяцей, якія недаатрымліваюць тое, што павінны былі атрымаць ад бацькоў. Таму падзяляю пазіцыю, што падтрымка дзяржавы павінна быць дыферэнцыяванай і кантраляванай. На тэрыторыі нашага сельскага Савета, напрыклад, значная колькасць сем'яў атрымала жыллё, пабудаванае з дзяржпадтрымкай. Гэта сем'і з дзецьмі, сем'і з шматдзетныя і малазабяспечаныя, але ў той жа час і сем'і, прызнаныя тымі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Нягледзячы на каласальную работу ўсіх суб'ектаў прафілактыкі, на жаль, здараюцца факты адабрання дзяцей з сем'яў. Здараецца, бацькі і скарысталіся сацыяльнай падтрымкай, і забяспечаныя жыллём, але ўсё роўна тое не шануюць. І мы сутыкаемся з фактамі, калі сродкі накіроўваюць не на патрэбу сваіх дзяцей. Гэта вельмі балюча казаць, таму што ў нашым сельсавеце ёсць шмат выдатных прыкладаў шчаслівых, вельмі моцных, працалюбных шматдзетных сем'яў. Шмат у нас актыўных шматдзетных бацькоў, якія могуць быць добрым прыкладам для іншых, як жыць у сельскай мясцовасці, выхоўваць дзяцей, браць актыўны ўдзел у самых розных конкурсах, прадстаўляць свой раён на сямейных фестывалях.

Людзі нашы вельмі актыўныя, неабыякавыя. Шмат хто працуе ў абласным цэнтры, і калі едзе з работы дадому ў раён, вядома, хоча таксама бачыць гарадскі камфорт у сельскай мясцовасці. Таму жыхарам нашага сельсавета вельмі блізкая тэма развіцця рэгіёнаў, сацыяльна значнай інфраструктуры, закранутая ў Пасланні Прэзідэнта. Хацелася б адзначыць тэму ўладкавання дарог, і ў прыватнасці, бетонных, як было адзначана кіраўніком дзяржавы. Магчыма, гэты напрамак будзе ў тым ліку разгледжаны для ўкаранення ў сельскай мясцовасці, таму што дарожнае пытанне вельмі актуальнае для ўсіх рэгіёнаў. Цікавіцца нашы жыхары, безумоўна, і тэмай медыцынскага абслугоўвання ў сельскай мясцовасці.

**Падрыхтавалі Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПАДАРУНАК ДА ДНЯ ГОРАДА

**Да канца чэрвеня ў Магілёве плануюць абсталяваць 12 дваровых тэрыторый універсальнымі комплексамі для адпачынку і заняткаў спортам.**



— У нас ужо практычна гатовыя праекты гэтых лакацый, — адзначыў **старшыня Магілёўскага гарсавета Максім ГУРЫН.** — Там будуць і спартыўнае абсталяванне, і малыя архітэктурныя формы, плюс правядзём добраўпарадкаванне. Праектная дакументацыя знаходзіцца на экспертызе, паралельна займаемся закупкай абсталявання. Як толькі пацяплее, хутчэй за ўсё, з красавіка, пачнём падрыхтоўку тэрыторый да ўстаноўкі комплексаў. У рамках гэтых работ зробім добраўпарадкаванне дарожак, пасадзім дрэвы і кусты. Запросім насельніцтва на суботнік, а таксама органы самакіравання, камунальныя службы, далучымся самі. Прэзентацыя цалкам добраўпарадкаваных і абсталяваных комплексамі дворыкаў адбудзецца напярэдадні Дня горада.

На навядзенне прыгажосці з бюджэту выдзелены мільён шэсцьсот тысяч рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Магілёўскага гарсавета дэпутатаў.**

# Ігнатаўна заклікае прыбрацца

## У Пінскім раёне актыўна наводзяць веснавы парадак

— Літаральна ва ўсіх населеных пунктах Пінскага раёна ўзяліся за навядзенне парадку і прыборку тэрыторый, — паведаміў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый БУШЫК.** — На прыборку выйшлі супрацоўнікі ўстаноў і арганізацый, школьнікі, пенсіянеры.

Прыклад падалі работнікі дзіцячых школ мастацтваў раёна, якія з граблямі і венікамі надалі тэрыторыі вакол сваіх школ дагледжаны і прыемны выгляд. Прыгожаму трэба вучыць ва ўстановах, якія радуюць вока нават на падыходзе да іх, лічаць работнікі. Менавіта такі выгляд набываюць школы мастацтваў у выніку працоўных дэсантаў. Побач з будынкамі разбіваюцца клумбы, высаджваюцца кветкі.



Тым часам пад кіраўніцтвам мясцовай улады вяскоўцы масава выходзяць на прыборку могілак. Жыхары вёскі Калавуравічы дружна прыйшлі на суботнік. Прыбралі лішнюю расліннасць, леташнюю траву, смецце на месцы спачыну сваякоў і аднавяскоўцаў. Пасля сумеснай работы на могілках кожны наводзіць парадак у межах і вакол сваёй сядзібы.



Адна з жыхарак вёскі Барычэвічы, пасля таго як прыбралася каля свайго дома і за агароджай, запісала відэа з заклікам далучацца да вясновай прыборкі. Гэтае відэа пад назвай «Ігнатаўна заклікае далучыцца» стала гуляць па многіх мясцовых чатах. Пенсіянеры з вёскі Купцічы, можа, і не глядзелі ролік, але таксама праяўляюць актыўнасць у справе веснавой прыборкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Пінскага райвыканкама.**

# БЕЛАРУСКАЕ ПРЫМОР'Е,

## або Чым сустракае турыстаў Вілейшчына

**Вілейшчыну называюць Прыморскім краем. Тут няма вялікай колькасці пасёлкаў, машын і ўсяго, што называюць урбанізаванай цывілізацыяй. Толькі шуміць вецер ды плешчуцца хвалі Вілейскага мора. Так з любоўю мясцовыя жыхары называюць Вілейскае вадасховішча. Праз раён цячэ прыгажуня Вілія, тут шмат малых рэк. Упрыгожваюць раён азёры, бясконцыя лясы. У гэтым непаўторным краі ёсць што паказаць і пра што расказаць турыстам.**



Чатыры аб'екты прыдарожнага сэрвісу, размешчаныя каля галоўных дарог, прапануюць вялізную колькасць паслуг. Тут можна прыпыніцца часова або пераначаваць, набыць тавары ў дарогу.

У раёне развіты аграэкатурызм. Адпачынак на прыродзе ўдалечыні ад клопатаў і мітусні даступны ў любы час, у тым ліку на выхадныя, у святы. Індывідуальны, сямейны адпачынак, карпаратыўныя мерапрыемствы — да паслуг любы фармат з максімальнымі выгодамі.

На беразе Вілейскага вадасховішча ў маляўнічых мясцінах знаходзяцца кемперныя стаянкі. На тэрыторыі кемпінгаў можна праводзіць карпаратывы. Для ўсіх гасцей кемпінга даступныя трансфер, кейтэрынг, уласная палявая кухня і адасобленыя домікі, дзе турысты могуць застацца на некалькі дзён.

У Вілейцы знаходзіцца краязнаўчы музей з выставачнай залай імя Нікадзіма Сілівановіча. Ва ўстанове амаль кожны месяц адкрываюцца новыя выставы, праходзяць творчыя сустрэчы і прэзентацыі. Музей запрашае да супрацоўніцтва мастакоў, калекцыянераў, народных умельцаў, творчыя калектывы, якім ёсць што паказаць і расказаць. А таксама рэалізоўвае пазнавальна-адукацыйны праект «Ценявая батлейка», які знаёміць жыхароў горада і раёна з гісторыяй роднага краю.

У вёсцы Ізбіно месціцца Вілейскі раённы Дом рамёстваў. Тут дзейнічае некалькі майстэрняў, дзе працуюць народныя ўмельцы па выцінанцы, пляценні з саломкі, бісеру, роспісе па дрэве, кераміцы, вышыўцы і іншыя. Таксама тут ёсць музей велікодных яек. Галоўнымі экспанатамі з'яўляюцца размаляваныя велікодныя яйкі, колькасць якіх ужо дасягнула 300. Усе яны зроблены з самых розных матэрыялаў: дрэва, гліны. Пры Доме рамёстваў працуюць дзесяць гурткоў, у тым ліку адзіны ў Мінскай вобласці гурток пчалярства. Кожны год Дом рамёстваў праводзіць майстар-класы для ўсіх ахвотных. Можна і заказаць вырабы адтуль.

У Вілейскім раёне статус гісторыка-культурных каштоўнасцяў нададзены 26 найбольш значным аб'ектам, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. 3 іх 7 — помнікі архітэктуры, 4 — помнікі гісторыі, 14 — археалогіі, 1 — помнік прыроды.



